www.nv-online.info

№ 8 (4260)

26 студзеня 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ВІТАЕМ!

Да нас едзе еўракамісар…

Так, 30 студзеня Мінск наведае еўракамісар **Ёханес Хан**. Той самы, які меў намер завітаць у Беларусь яшчэ восенню мінулага года, але тады візіт быў адкладзены не па ініцыятыве Мінска. Як, дарэчы, і перад Новым годам, калі тэрміновыя справы не дазволілі еўракамісару прыбыць з візітам у Беларусь.

30 студзеня ён плануе сустрэцца ў Мінску з кіраўніцтвам урада і Міністэрства замежных спраў і абмеркаваць шырокае кола пытанняў узаемадзеяння Беларусі і Еўрасаюза.

ФАКТ

Тысячу рублёў у сярэднім плацілі толькі ў Мінску

Белстат апублікаваў дадзеныя аб сярэдняй налічанай зарплаце ў снежні 2017 года.

У Мінску гэты паказчык склаў 1360,4 рубля. У іншых рэгіёнах дасягнуць абяцанай зарплаты ў 500 долараў не атрымалася. Там у снежні сярэднія заробкі былі такія:

Мінская вобласць – 967,1 рубля


Брэсцкая – 899,1
Гродзенская – 894,4
Гомельская – 893
Магілёўская – 854,6
Віцебская – 836,1 рубля.

Пры гэтым, адзначаюць эксперты, заробкі ў снежні заўсёды большыя, чым у астатнія месяцы, бо звычайна людзям выплачваюць гадавыя прэміі і іншыя бонусы.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

Урад разлічвае ў 2018 годзе стварыць 70 тысяч рабочых месц, –

заявіў учора падчас рабочай паездкі ў Лагойскі раён прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў



ЧУЛІ?



Учора Аляксандр Лукашэнка назваў "лухтой апошняй" выказванні, што ён пойдзе на датэрміновыя выбары, каб выйграць час.

УЧОРА

Пададзена заяўка на правядзенне акцыі з нагоды 100-годдзя абвяшчэння БНР

Як паведаміў БелаПАН сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» **Павел Севярынец**, заяўку падпісалі прадстаўнікі 13 партый і арганізацый, якія ўваходзяць у аргкамітэт па правядзенні акцыі (Партыя БНФ, аргкамітэт па стварэнні БХД, Аб'яднаная грамадзянская партыя, рух «За Свабоду», рух салідарнасці «Разам», Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), аргкамітэт па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада), аргкамітэт партыі «Беларускі рух», ініцыятыва «Дзея», прафсаюз РЭП, рух «За незалежнасць і дзяржаўнасць», кампанія «Еўрапейская Беларусь»).

Актывісты апазіцыі просяць Мінгарвыканкам дазволіць не толькі традыцыйную дэманстрацыю і мітынг, але і канцэрт у цэнтры горада.

НУ І НУ!

Ці яно таго варта?

Праваахоўнікі затрымалі ў Пінску інжынера станцыі тэхнічнага абслугоўвання, які браў хабары у памеры 20 беларускіх рублёў за вырашэнне пытання аб праходжанні тэхнічнага агляду. Ён затрыманы. Мужчыне, якому 31 год, пагражае да 10 год зняволення і канфіскацыя маёмасці.

Ці яно таго варта?

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ



Елена МОЛОЧКО

В Москве – буря, а в Минске у чиновников затылки болят

Будет ли показана в белорусских кинотеатрах комедия британского режиссера Армандо Ианучче «Смерть Сталина»? Пока фильм не получил прокатного удостоверения от Министерства культуры, продажа билетов на киносеансы в столице приостановлена. Так как большинство из нас ленту не видело (хотя она уже вроде бы выложена в интернет), то невозможно от первого лица говорить о ее художественных достоинствах или просчетах. Но вот о том, что Министерство культуры Республики Беларусь, как на веревочке, ходит за Министерством культуры России, говорить приходится, потому что это очевидно.

Если бы в России несколько дней назад не появилось письмо деятелей культуры с призывом снять с проката «Смерть Сталина», в Минске, мне кажется, вряд ли бы этому фильму уделили пристальное внимание. Обычно республиканская экспертная комиссия по предотвращению пропаганды порнографии, насилия и жестокости при Минкульте РБ приходит в кинотеатр на первый сеанс нового фильма, смотрит его вместе со всеми, а потом постфактум обозначает для фильма возрастное ограничение и дает заключение, соответствует ли фильм белорусскому законодательству.

По такому сценарию должны были развиваться события и сейчас. Поэтому фильм «Смерть Сталина» стоял в планах нескольких частных кинотеатров Минска, и ничего, как говорится, не предвещало. И то правда: почему, собственно, о тиране нельзя показывать комедию? Даже черную, злую, саркастическую? Лишь бы не безвкусица. В конце концов, человечество, смеясь, расстается со своим прошлым. Или же не расстается совсем. Потому что нельзя постоянно со звериной серьезностью оглядываться на все события, выпавшие на нашу долю. Есть дни великой скорби – но именно что дни. А в целом жизнь хочется провести на оптимистической ноте. Тем более если ты здоровый человек. А как иначе смотреть в будущее?

Но в Москве случилась очередная идеологическая буря, и в Минске у чиновников сразу затылки болят.

Несколько дней назад ведущие российские общественные деятели назвали этот фильм «пасквилем на историю» и «плевком в лицо» всем, кто погиб во время Сталинградской битвы – 2 февраля будет отмечаться ее 75-летие. Издание «Комсомольская правда» вообще вышло с пугающим заголовком «Смерть Сталина» – комедия, которую мог бы снять Гитлер».

Мурашки по коже… Попробуй возрази после упоминания этого имени.

И фильм в России приговорили. К запрету. По крайней мере на ближайшее будущее.

Вслед за Москвой и у наших чиновников поднялись ушки на макушке. Нет бы раньше, самостоятельно – это был бы несколько другой разговор. А хождение строем за соседним государством вызывает ироническую улыбку. Сразу вспоминается хрестоматийное из прошлых времен: "Я Пастернака не читал, но осуждаю…"

Правда, Минкульт РБ оставил себе небольшой люфт для маневра. Было заявлено, что решение будет принято, как только будет получена копия для просмотра на носителе. А ее должны были получить 25 января. Так что сегодня, в день выхода газеты, ситуация наверняка уже прояснилась. Но я лично опасаюсь иного: вполне возможно, что фильм – обыкновенный кич. Обычно иностранцы (англичане особенно) о чужой истории и о чужих страданиях говорят свысока, а этот фильм произведен совместными усилиями Великобритании и Франции. И тогда действительно больно – от пошлости. Аж ком в горле. Помните у Андрея Вознесенского: «Я не знаю, как остальные, но я чувствую жесточайшую не по прошлому ностальгию – ностальгию по настоящему».

ФИНАНСЫ

Нацбанк: итоги 2017-го и прогнозы на 2018-й

Об инфляции

Как отметил начальник главного управления монетарной политики и экономического анализа Национального банка **Дмитрий Мурин** на 81-м заседании Республиканского клуба директоров, с точки зрения достижения уровня инфляции 2017 год выдался рекордным. Показатель в 4,6% он назвал очень хорошим уровнем и сказал, что базовая инфляция в стране еще ниже, она составила в 2017 году 2,5%.

«Нужно отметить, что замедление инфляции идет очень равномерно. И этому способствовали различные благоприятные факторы. Так, первая половина года характеризовалась стабильной ситуацией на валютном рынке, даже в большей степени было характерно укрепление белорусского рубля», – рассказал представитель Нацбанка.

Согласно планам на 2018 год, регулятор ставит задачу удержать инфляцию на уровне не более 6%.

Как заметил Дмитрий Мурин, экономика Беларуси выходит из рецессии, возобновляется рост доходов населения. Он назвал это теми основными факторами, которые в текущем и следующих годах будут оказывать некоторые инфляционные давления. По его словам, этим как раз и объясняется то, что в нынешнем году необходимо удержать инфляцию на уровне 6%.

В свою очередь он также обратил внимание на еще один важный фактор – инфляционные ожидания в стране.

«Мы проводили в ноябре опрос среди физлиц, – отметил он. – *И оказалось, что ощущаемый уровень инфляции среди населения выше статистических показателей. Практически все опрошенные ощущают инфляцию на уровне 13%, и большая часть респондентов отвечала, что такую же инфляцию они ожидают и в следующем году»*.

В Нацбанке отметили, что в связи с этим достаточно важным является преодоление данного психологического барьера среди населения и субъектов хозяйствования.

Об обменном курсе

Низкая инфляция, еще раз подчеркнул Дмитрий Мурин, была связана в том числе и с ситуацией на валютном рынке.

«В течение года на рынке сформировалось в целом чистое предложение, в основном за счет продажи валюты населением. В любом случае курс оставался достаточно стабильным. По итогам года стоимость корзины выросла на 6%. А та динамика курса, которая сформировалась на рынке, благоприятно сказывалась на ценовой способности белорусского экспорта», – рассказал он.

По оценке Нацбанка, курс находится вблизи своего равновесия. На сегодня фундаментальных предпосылок для серьезных изменений валютного курса нет.

О процентных ставках

Представитель Нацбанка коснулся во время встречи республиканского клуба директоров еще одной важной темы – процентных ставок.

Как отметил Дмитрий Мурин, та ситуация, которая сформировалась в экономике в 2017 году, позволила Нацбанку снижать процентные ставки более быстрыми темпами, чем предусматривалось и прогнозировалось.


По его словам, в прошлом году в Беларуси снизили ставку рефинансирования на 7 процентных пунктов, а ставки по кредитам – с 20% до 11%.

«Уровень ставок, который сейчас сформировался на кредитно-депозитном рынке – это минимальный уровень ставок, такого еще не было, – рассказал представитель Нацбанка. – *Наверное, не стоит ожидать, что в этом году продолжится такое же снижение ставок по депозитам. Я ориентировал бы на то, что снижение скорее всего продолжится, но оно будет минимальным. И если мы видим, что ставку рефинансирования еще можно снизить на один процентный пункт, то снижение ставки по кредитам для реального сектора экономики скорее будет в этих пределах, а может даже чуть меньше»*.

По словам представителя Нацбанка, все будет зависеть от того, как будет складываться ситуация в целом в экономике.

(«Ежедневник».)

У СУСЕДЗЯЎ



Вільнюс адзначыў 695-ы дзень нараджэння

Так, учора сталіца Літвы святкавала. Мэрыя парадавала масай прыемных сюрпрызаў як жыхароў горада, так і яго гасцей. У школах прайшоў урок па гісторыі Вільнюса.

Упершыню ў гістарычных крыніцах Вільнюс згадваўся 25 студзеня 1323 года.

БРЫФІНГ

Тэрмін утрымання пад вартай абвінавачанага ва Украіне ў шпіянажы беларускага грамадзяніна Юрыя Палітыкі працягнуты да 26 лютага

Тэрмін утрымання пад вартай абвінавачанага ўкраінскімі ўладамі ў шпіянажы беларускага грамадзяніна Юрыя Палітыкі працягнуты да 26 лютага, паведаміў учора на брыфінгу прэс-сакратар МЗС **Дзмітрый Мірончак**.

«Сітуацыя вакол затрымання ва Украіне беларускага грамадзяніна пастаянна знаходзіцца ў поле зроку МЗС Беларусі. Так, я гатовы пацвердзіць, што нарэшце, праз сем месяцаў пасля затрымання, яму выстаўлена абвінавачанне і чарговым разам працягнуты тэрмін утрымання пад вартай», – сказаў Д.Мірончык.

«Згодна з наяўнай у нас інфармацыяй, ізраз абставін, на якія, у прыватнасці, паказвала пракуратура нашай краіны, і метады, якія ўжываліся да нашага грамадзяніна, ставяць пад сумнеў сам факт нібыта ўчыненага дзеяння», – заявіў прадстаўнік МЗС.

Ён падкрэсліў, што на гэтым фоне пад пытаннем сама ўкраінская трактоўка сітуацыі і выстаўлены Юрыю Палітыку абвінавачанні ў шпіянажы.

Паводле звестак МЗС, беларускі грамадзянін накіраваў зварот у міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ў Камітэт ААН па правах чалавека *«ў сувязі з парушэннем яго правоў і выкарыстаннем недазволеных метадаў дазнання, прасцей кажучы – катаванняў». «Так гэта ці не, будзем разбірацца. Мы таксама будзем на гэтым настойваць. Пакуль нашы афіцыйныя звароты да ўкраінскага боку з просьбай аб медыцынскім аглядзе затрыманага засталіся без адказу»*, – адзначыў Мірончык.

Юрый Палітыка таксама паведаміў беларускім дыпламатам, што ўкраінскі бок фактычна не разглядаў яго афіцыйныя скаргі. *«Так быць не павінна»*, – заявіў Мірончык.

Абвінавачанне ў шпіянажы Палітыку было выстаўлена 23 студзеня. Яму інкрымінуюць здзяйсненне злачынства на падставе ч.1 арт.114 КК Украіны (шпіянаж; перадача або збіранне з мэтай перадачы замежнай дзяржаве, замежнай арганізацыі ці іх прадстаўнікам звестак, якія складаюць дзяржаўную тайну, калі гэтыя дзеянні ўчынены замежнікам або асобай без грамадзянства). У выпадку доказу судом віны Юрыю Палітыку пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі. Артыкул таксама прадугледжвае магчымасць канфіскацыі маёмасці.

Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.
(БелаПАН.)

ВІНШУЕМ!



Яны паедуць на Алімпіяду-2018 у Пхёнчхан

На XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях у біятлоне выступяць:
Дар'я Домрачава,
Надзея Скардзіна,
Ірына Крыўко,
Надзея Пісарава,
Дзінара Алімбекава,
Уладзімір Чапелін,
Сяргей Бачарнікаў,
Максім Варабей,
Раман Ялётнаў,
Антон Смольскі.

У фрыстайле Беларусь прадставяць:
Антон Кушнір,
Станіслаў Гладчанка,
Максім Гусцік,
Ала Цупер,
Ганна Гуськова,
Аляксандра Раманоўская.

У лыжных гонках на сваю сёмую Алімпіяду паедзе:
Сяргей Далідовіч,
Аляксандр Воранаў,
Юрый Астапенка,
Міхаіл Сямёнаў,
Юлія Ціханава,
Паліна Сераносава,
Настасся Кірылава.

У гарналыжным спорце Беларусь прадставяць:
Марыя Шканава,
Юрый Данілачкін.

У канькабежным спорце выйдуць на лядовы авал:
Марына Зуева,
Ігнат Галавацюк.

У шорт-трэку Беларусь прадставіць:
Максім Сяргееў.

Нагадаем, што Гульні пройдуць з 9 па 25 лютага, будзе разыграна 102 камплекты ўзнагарод у 7 відах спорту па 15 дысцыплінах. Усяго ў Беларусі – 28 ліцэнзій.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

Мир никогда не будет прежним

Скандал по поводу трех «неудов», поставленных лидеру молодежного крыла Партии БНФ Анне Похолко, которая училась на факультете журналистики БГУ вызвал в моей памяти личные воспоминания. Разумеется, о собственной студенческой юности.

Шел 1986 год. На филфаке Гродненского университета многие влиятельные люди были очень недовольны доцентом Игорем Егоровым. Чтобы свести с ним счеты, кто-то решил доказать его несостоятельность в качестве научного руководителя – на моем примере. В результате проректор по научной работе (специалист по научному коммунизму) затребовал мою дипломную работу на рецензию (на что имел право) – и менее чем за сутки до защиты я узнал, что он предлагает поставить мне «тройку».

По распределению я шел первым. То есть юридически я был лучшим выпускником своего курса.

Дело было в апреле. Занятий у нас уже не было, но Игорь Вячеславович должен был провести лекцию и две пары семинаров по теории литературы. Поэтому мне нужно было шесть часов где-то блуждать. А в Гродно приехал минский камерный оркестр. Играли Моцарта – в здании Дома офицеров, соседнем с нашим главным университетским корпусом. Я купил билет и пошел слушать Моцарта.

Вышел я из зала с полной уверенностью в том, что мир прекрасен. Я когда-нибудь умру. Мой рецензент наверняка умрет. А Моцарт – останется. Значит, мир прекрасен! Чем я рискую? Оценкой за диплом? Но ведь жизнь продолжится, и музыка Моцарта будет звучать вечно.

Диплом я защитил на «отлично». А спустя десятилетия Игорь Вячеславович под страшным секретом сказал мне, что когда он решил через год сделать на память копию той «троечной» рецензии, выяснилось, что ее кто-то изъял из дела.

Из дела. Но не из нашей памяти.

Мир взаимоотношений студентов и преподавателей никогда не будет прежним. Эти взаимоотношения могут быть основаны или на доверии и уважении, или на презрении друг к другу. Раньше во многом основывались на страхе: выпустят с «волчьим билетом», говорила мне мама, и пойдешь на фабрику ящики сколачивать. Страха перед оценкой больше не будет никогда. Студент понимает, что он – человек, а не быдло. И дорогу в жизни он найдет. Но…

Я очень недоволен нынешней молодежью. А когда в интернете читаю мнение – дескать, можно писать с ошибками, лишь бы думать умели, – мое недовольство возрастает все больше. Студент второго курса обязан уважать если не преподавателя, то хотя бы себя, чтобы не допускать элементарных орфографических ошибок – раз уж по централизованному тестированию он в средней школе получил «девятку».

Но и преподаватель должен уважать себя. Поставленные им оценки должны быть очевидны и оправданны. Иначе как учить детей? С диктофоном, на который вы без их ведома фиксируете их ответы? То есть вы заранее знаете, что оценка может быть оспорена? Тогда чему вы их учили эти годы?

В МГУ «завалили» студента. Просто – не приняли у него экзамен. Преподаватель отказался принимать. Студент пришел на экзамен в кипе, а согласно уставу МГУ студенты не могут находиться в помещении в верхней одежде и головных уборах. Ему предложили снять кипу или выйти из аудитории. А когда он сказал, что у него религиозный праздник (Йом-Кипур), то в ответ ему предложили покреститься. Последнее, с моей точки зрения, было излишним, ибо было хамством.

Формально – все правильно. Университет – учреждение светское, и учитывать религиозные убеждения студентов не обязан. Но значит ли это, что преподаватель не имеет права их учитывать? Или – обязан их НЕ учитывать?

Мне кажется, это вопрос доброй воли преподавателя. Он должен быть не только старше и образованнее, но и мудрее.

Я не знаю: те три преподавательницы, которые поставили «неуды» студентке Анне Похолко, – они действительно считают, что таким образом заставят ее выучить их дисциплины? Особенно если Анну и впрямь отчислят? Я не очень верю в то, что студентка, сдавшая тестирование по русскому языку на высшую оценку, через два года могла забыть русский язык настолько, чтобы получить «неуд». И – как преподаватель этики в средней школе – я точно знаю, что любой мыслящий человек способен сдать этот предмет хотя бы на «удовлетворительно», даже если речь идет о профессиональной – в данном случае журналистской – этике.

Мир не будет прежним. Он стал огромным. У людей множество возможностей. Девушка, отчисленная из БГУ, спокойно может продолжить учебу в других университетах. Я не получил направления в аспирантуру, несмотря на «красный» диплом и публикацию в «Болдинских чтениях», – и что из этого? Жизнь не сломалась. Моцарт продолжает звучать.

Но писать все равно нужно грамотно. На подъезде моего дома до сих пор висит реклама новогоднего представления «Куры не против лис», где сказано, что в программе принимает участие «ПРЕЗИДЕНСКИЙ ОРКЕСТР». Так и написано. Организации, подчиняющиеся Управлению делами президента, не знают, как пишется слово «президенТский». А госпожа Десюкевич пытается начать искоренение всеобщей безграмотности со студентки-второкурсницы…

Давайте лучше послушаем Моцарта!

БЛІЦ





Мікалаў Казлоў спрабаваў праз суд дабіцца ўключэння ва ўчастковыя камісіі сваіх прадстаўнікоў…

Браць пад «кругласутачны прыцэл» выбарчыя ўчасткі Мікалай Казлоў намеру не мае

Не сакрэт, выбары ў нас праходзяць пад дыктоўку ўлад. Каб дэпутацкія мандаты атрымалі "свае людзі", на якія толькі маніпуляцыі не даводзіцца ісці! На парламенцкіх выбарах 2008 года, працуючы ў органах унутраных спраў, падпалкоўнік Мікалай Казлоў сам выкрыў фальсіфікатараў. Сёлета ён балатуецца кандыдатам у Мінскі гарадскі Савет. Ці ёсць у яго і яго каманды магчымасць "перакрыць кісларод" тым, хто, не выключана, паспрабуе ператварыць выбары ў фарс?

– Мікалай, колькі ў вашай акрузе участкаў для галасавання?

– 14, як і практычна па ўсіх акругах Мінска.

– Ці ва ўсіх участковых выбарчых камісіях ёсць людзі, у сумленнасці якіх вы ўпэўнены і якіх можаце папрасіць пракантраляваць ход кампаніі ў адпаведнасці з заканадаўствам, як кажуць, знутры?

– Канешне, не. Мы спрабавалі дэлегіраваць нашых прадстаўнікоў ва ўсе 14 участковых выбаркамаў акругі, прапаноўвалі людзей пісьменных, добра знаёмых з перадвыбарнай кухняй – былых дэпутатаў Вярхоўнага Савета, вопытных юрыстаў. Але ніводны з іх уключаны не быў! Мне смешна, калі Ярмошына ці яе памагатыя кажуць, што прадстаўнікі незалежных кандыдатаў не праходзяць па конкурсе, бо не адпавядаюць нейкім там патрабаванням. Хто не адпавядае? Аляксандр Дабравольскі? Анатоль Лябедзька? Антаніна Кавалёва, якая зараз якраз займаецца законапраектам па выбарах, які прапаноўвае АГП? Сораму няма ў спадарыні Ярмошынай…

Я прысутнічаў 3 студзеня ў адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска на спектаклі – інакш назваць не магу, – калі зацвярджаліся ўчастковыя камісіі. Усе там мелі гатовыя спісы і ў адпаведнасці з гэтымі спісамі галасавалі з хуткасцю кулямёта, без прамашкі выкошваючы прадстаўнікоў нашай партыі.

– Вы не спрабавалі аспрэчыць гэтае рашэнне?

– Яшчэ як спрабаваў! Звяртаўся ў суд. У скарзе мне адмовілі, маўляў, у камісіях ёсць прадстаўнікі розных партый, а што ад АГП ніхто не трапіў – бывае… Але я ўпэўнены, што ў камісіі ўключаны, як правіла, людзі з аднаго і таго ж працоўнага калектыву, узначальваюць іх начальнікі, ад якіх яны залежаць. Пасля суда я звярнуўся ў адміністрацыю Цэнтральнага раёна з заявай, каб мяне азнаёмілі з дакументамі па складах камісій. Мне было адмоўлена, і я маю намер зноў ісці ў суд.

Таксама я засяроджваў увагу на тым, што ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам склад участковай камісіі можа быць павялічаны да 19 чалавек, і прапаноўваў гэта зрабіць. Дапусцім, іншыя партыі вылучылі ў камісіі годных людзей, але ж і нашы кандыдаты не горшыя. Каб не было ніякіх пытанняў ні ў апазіцыі, ні ў грамадскасці, ні ў еўрапейскіх структур, проста павялічце склад камісій. Але ж не! Тады ж вынікі галасавання не сфальсіфікуеш!

– У такім выпадку які заслон вы можаце паставіць усялякага кшталту фальсіфікацыям?

– Мы рыхтуем назіральнікаў і пастараемся, каб увесь перыяд, калі будзе ісці датэрміновае галасаванне, і ў дзень асноўнага яны дзяжурылі на ўсіх 14 участках маёй акругі. Назіральнікі будуць лічыць яўку, адсочваць сітуацыю на ўчастках. Думаю, гэтага цалкам дастаткова, каб зрабіць высновы пра тое, як праходзяць выбары.

– А ці не пайсці такім шляхам: вы падымаеце на ногі ўсіх сябраў вашай гарадской партыйнай арганізацыі і з першага дня датэрміновага галасавання наладжваецца кругласутачны кантроль-назіранне на некалькіх найбольш буйных выбарчых участках. Днём вашы прадстаўнікі, мяняючыся праз кожныя тры-чатыры гадзіны, адсочваюць сітуацыю ў зале, дзе стаяць урны, а з вечара і да раніцы дзяжураць ля ўсіх уваходаў і выхадаў, каб ні адна пабочная асоба не пранікла ў памяшканне і не зрабіла крымінальны ўкід бюлетэняў альбо наогул не замяніла урны… Калі на кругласутачна кантралюемых участках вынікі галасавання будуць значна адрознівацца (вядома ж, у лепшы бок) ад усіх астатніх, тады вы зможаце на ўвесь свет заявіць аб нелегітымнасці выбараў у сувязі з фальсіфікацыяй.

– Гэта больш падобна на сцэнарый дэтэктыву. Рабіць гэтага мы не будзем таму, што ва ўлад значна больш магчымасцяў для процідзеяння – у яе ёсць апараты МУС, КДБ, МНС… У гэтым сэнсе канкурыраваць з уладай мы не зможам. Ды, думаю, і не трэба.

– Калі арганізоўваць кругласутачнае назіранне на шэрагу ўчасткаў лічыце немэтазгодным, то ці мяркуеце вы прыбегнуць да пераліку бюлетэняў ужо на наступны дзень пасля галасавання? Такую магчымасць прадастаўляе выбарчае заканадаўства…

– Гэта не першыя выбары ў краіне, якія праводзіць Ярмошына са сваёй камандай. Колькі было выпадкаў, калі людзі абураліся вынікамі галасавання, патрабавалі пераліку. Усё марна. Нескладана зрабіць высновы, што ніхто такой магчымасці нам не дасць і ў гэты раз. Калі яны захочуць сфальсіфікаваць вынікі выбараў – яны гэта зробяць. Адзінае, што мы можам супрацьпаставіць, – фіксаваць факты фальсіфікацый і казаць пра іх услых на ўсю краіну, на ўсю Еўропу.

Марыя ЭЙСМАНТ.

Ад рэдакцыі

Вось такая пазіцыя ў Мікалая Казлова – аднаго з кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета. Цікава, а што думаюць на гэты конт іншыя прэтэндэнты на дэпутацкі мандат? Магчыма, адгукнуцца і шараговыя чытачы "Народнай Волі". Рэдакцыя гатова да працягу размовы на актуальную тэму.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аксана Мянькова абяцае…

На Алімпіядзе-2008 у Пекіне Аксана Мянькова заваявала залаты медаль у кіданні молата і была прызнана ў Беларусі лепшай лёгкаатлеткай года.

Але ў лістападзе 2016 года прэс-служба Міжнароднага алімпійскага камітэта паведаміла, што *"пасля паўторнага аналізу допінг-проб, праведзенага з дапамогай новых тэхналогій, Аксана Мянькова абвінавачана ва ўжыванні забароненых рэчываў турынабола і аксандралона і пазбаўлена залатога медаля"*.

Апошнім часам былая алімпійская чэмпіёнка працуе ў Магілёве дырэктарам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву №5, а зараз вырашыла паспрабаваць свае сілы на выбарах у Магілёўскі гарсавет – яна балатуецца па Заводскай выбарчай акрузе №2.

– Вы самі вырашылі падацца ў дэпутаты ці нехта падштурхнуў да гэтага?

– Гэта рашэнне маё і калектыву, у якім я працую. Вырашыла дапамагчы гораду, сваёй спартыўнай школе, людзям. Усё ж-такі я не апошні чалавек у Магілёве і ў краіне, таму, калі стану дэпутатам, думаю, да майго меркавання будуць прыслухоўвацца.

– З кім паспаборнічаеце на выбарах?

– Адзін канкурэнт прадстаўляе камунальнае прадпрыемства цеплаэнергетыкі, а другі працуе памочнікам майстра на ААТ "Магатэкс".

– І што абяцаеце выбаршчыкам?

– Па-першае, у тым раёне Магілёва, дзе я балатуюся, мякка будзе сказана, не зусім добрыя дарогі. Хачу, каб былі прыведзены ў парадак таксама дзіцячыя пляцоўкі. Многія з іх ужо даўно чакаюць "рэстаўрацыі", і гэта таксама праблема для дзяцей і бацькоў. Акрамя таго, на базе нашай школы марым зрабіць адкрытую спартыўную пляцоўку, вырашыць пытанне нармальнага асвятлення вуліц… Вось усе гэтыя праблемы і збіраюся "прабіваць", калі атрымаецца стаць дэпутатам.

– Думаеце, што ў дэпутатаў мясцовых Саветаў столькі паўнамоцтваў, што яны могуць на нешта паўплываць?

– Я буду рабіць прапановы ўладам, а далей будзе бачна. Калі нешта талковае параіць, то няўжо гэта адразу праігнаруюць?

– Колькі подпісаў сабрала ваша ініцыятыўная група?

– Больш за 260, хаця дастаткова было і 75. Дарэчы, група была даволі невялікая – усяго чатыры чалавекі. Але, як кажуць, галоўнае не колькасць, а якасць…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПАДЛІЧЫЛІ...

Унёсак мытнікаў – 3 мільярды 670 мільёнаў долараў

Менавіта на такую суму папоўнілі ў мінулым годзе бюджэт беларускія мытнікі. Яна на 9,6 працэнта перавышае суму пазамінулага года.

Што і казаць, расце грузапаток праз мяжу. Калі параўноўваць з 2016 годам, то ў 2017-м аб'ём *"увезеных цераз Беларусь у межах ЕАЭС тавараў, у тым ліку транзітных, павялічыўся на 16% (аўтамабільным транспартам – на 12%, чыгуначным – на 22%)"*.

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

В 2017 году у пьяных водителей в Брестской области конфисковано 117 транспортных средств

Согласно данным прокуратуры, в 2017 году в Брестской области по решению судов у пьяных водителей было конфисковано 117 транспортных средств.

По 117 уголовным делам, расследованным по ст. 317-1 Уголовного кодекса (управление транспортным средством лицом, находящимся в состоянии опьянения, передача управления транспортным средством такому лицу либо отказ от прохождения проверки (освидетельствования)), в Брестской области конфисковано 117 транспортных средств, из них 85 легковых автомобилей, 15 скутеров, 14 мотоциклов, 1 сельскохозяйственная машина, сообщила пресс-служба Генеральной прокуратуры.

Транспортные средства в количестве 74 единиц принадлежали на праве собственности обвиняемым, 16 фактически принадлежали обвиняемым, но были зарегистрированы на других лиц, 24 были собственностью иных граждан и 1 юридического лица, 2 вовсе не были зарегистрированы.

(БелаПАН.)

АНТЫРЭКЛАМА

Годнасць беларускага тварагу

Жыхарка Ліпецка набыла пачак тварагу вытворчасці гомельскага аб'яднання "Мілкавіта". Як вынікае з фотаздымка, надрукаванага ёю ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте", дапушчальны тэрмін захавання – 31 лютага.

Нічога не зробіш. Пачуццё ўласнай годнасці нашых вытворцаў такое, што нават у лютым у іх – 31 дзень.

З НАГОДЫ

У вёсцы адкрыюць музей Высоцкага

Сваячка вядомага барда і акцёра Уладзіміра Высоцкага, 80-годдзе з дня нараджэння якога адзначалася ўчора, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі мастацтвазнаўца Надзея Высоцкая збіраецца адкрыць музей у гонар славутага сваяка ў вёсцы Вялешына Капыльскага раёна.

Гэта не першы выпадак, калі будзе адкрыты народны музей у гонар дзеяча эстрады. Так, у 2010 годзе ў Старых Васілішках Шчучынскага раёна пачаў працу клуб-музей Чэслава Немэна.

ЧУЛІ?

Студэнта дэпартуюць за бойку

Студэнта з Ірака, які вучыўся ў адной з гродзенскіх ВНУ і распачаў бойку падчас дыскатэкі, дэпартуюць з Беларусі да 31 снежня. Адбылося гэта яшчэ 19 лістапада, але ж разбіраліся са здарэннем дагэтуль. Гродзенец, з якім біўся замежнік, і ягоны крыўдзіцель паспелі памірыцца, але ж рашэнне было прынятае.

У былога ўжо студэнта ёсць выбар: ён можа з'ехаць добраахвотна і за свой кошт, але ж і ў гэтым выпадку на працягу пяці год не будзе мець права вярнуцца ў Беларусь.

СВАБОДА СЛОВА

За што канкрэтна заблакіравалі сайт «Хартыя'97»?

Гэтае пытанне "Народная Воля" задала прадстаўнікам Міністэрства інфармацыі. Аднак чыноўнікі зрабілі выгляд, быццам не зусім разумеюць, пра што гаворка.

– Чытайце ўважліва наш сайт – там выкладзена ўся інфармацыя, – *адказала "Народнай Волі" нейкая супрацоўніца міністэрства па тэлефоне першага намесніка міністра* ***Ігара Луцкага****. І дадала, што сам Ігар Уладзіміравіч з'ехаў на мерапрыемства ў Савет міністраў. А міністр інфармацыі* ***Аляксандр Карлюкевіч*** *адмаўляў журналістам у каментарыях наконт блакіроўкі "Хартыі", спасылаючыся на бальнічны.*

– Дык у вас на сайце ў навіне пра блакіроўку ёсць толькі спасылка на закон аб сродках масавай інфармацыі, але няма пераліку артыкулаў "Хартыі", у якіх парушаецца норма закона.

– Нічога не ведаю. Мне сказалі адказваць так...

– А як ваша імя, на каго спаслацца?

– Прабачце, званкоў шмат. Глядзіце наш сайт...

Што напісана на сайце Мініфарма?

"Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь на падставе падпункта 1.2 пункта 1 артыкула 51[1] Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі" прынята рашэнне аб абмежаванні доступу да інфармацыйнага рэсурсу charter97.org.

Дадзенае рашэнне прынята ў сувязі з размяшчэннем на рэсурсе інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена артыкулам 38 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі".

Міністэрства інфармацыі ў чарговы раз звяртае ўвагу ўсіх суб'ектаў інфармацыйнай сферы на неабходнасць няўхільнага выканання заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі".

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Наталля РАДЗІНА:

«Не выключана, што за блакіраваннем папулярных сайтаў можа стаяць маскоўская Лубянка...»

– Безумоўна, чыноўнікі сёння хаваюць галаву ў пясок і не называюць канкрэтнай прычыны блакіравання сайта, – *гаворыць рэдактарка сайта Наталля Радзіна*. – Мы не ведаем, з чым гэта звязана. Нас ні пра што не апавяшчалі, мы паняцця не маем, як парушылі беларускае заканадаўства.

Не выключана, што за блакіраваннем папулярных сайтаў можа стаяць маскоўская Лубянка, паколькі ідзе зачыстка інфармацыйнай прасторы менавіта ад беларускіх незалежных медыя. І атрымліваецца, што інфармацыйнае поле нашай краіны трапляе пад уплыў расійскіх прапагандысцкіх медыя.

– Што вы будзеце рабіць далей? Як будзе функцыянаваць сайт?

– Звяртаюся да ўсіх журналістаў, калег з розных краін свету, каб паведамлялі пра тое, што наш сайт трапіў пад блакіроўку.

Інфармую пра сітуацыю праваабарончыя арганізацыі, толькі цяпер размаўляла з прадстаўнікамі АБСЕ, Камітэтам абароны журналістаў – яны таксама будуць рэагаваць.

Будзем звяртацца ў еўраструктуры з просьбай аказаць ціск на беларускія ўлады і прымусіць іх спыніць знішчэнне незалежных медыя.

– А што наконт перамоў з прадстаўнікамі Міністэрства інфармацыі?

– Якраз абмяркоўваем, ці варта гэта рабіць, ці не бессэнсоўна гэта. Беларуская асацыяцыя журналістаў ужо прапанавала нам юрыдычную падтрымку, за што ім вялікі дзякуй.

– Сайт "Беларускі партызан" пасля блакіроўкі перайшоў у беларускую прастору – з адкрытым забралам...

– Мы гэтага дакладна рабіць не будзем. Гэта наша прынцыповая пазіцыя.

Марына КОКТЫШ.

ЗАЯВА

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пратэстуе супраць блакіроўкі грамадска-палітычных сайтаў

Гэта ўжо другое цягам месяца рашэнне Міністэрства інфармацыі аб абмежаванні доступу на тэрыторыі Беларусі да папулярных інфармацыйных рэсурсаў. Нагадаем, што ў снежні было прынята рашэнне пра блакіроўку сайта "Беларускі партызан".

У абодвух выпадках рашэнні аб абмежаванні свабоды выказвання прымаліся непразрыста, без паведамлення, якія менавіта матэрыялы сталі падставай для блакіроўкі, у чым яны парушаюць беларускае заканадаўства. Не было на гэты конт і судовага рашэння.

Паведамленне на сайце Мінінфарма аб тым, што на сайце "Хартыя'97" была размешчана інфармацыя, якая парушае патрабаванні арт. 38 Закона "Аб СМІ", нічога не тлумачыць, бо сам пералік інфармацыі, забароненай для распаўсюджвання, вельмі шырокі і, больш за тое, не закрыты.

Патрабуем ад Міністэрства інфармацыі растлумачыць:

- якія менавіта прэтэнзіі і да якіх менавіта матэрыялаў былі нагодай для блакіроўкі сайта "Хартыя'97", а раней – сайта "Беларускі партызан";
- на падставе якіх менавіта рашэнняў судовых ці іншых органаў прынята рашэнне аб абмежаванні доступу да сайта.

Лічым блакіроўку сайта "Хартыя'97", як і блакіроўку сайта "Беларускі партызан", недапушчальным абмежаваннем свабоды выказвання, якое груба парушае артыкулы 33 і 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародныя абавязацельствы краіны. Звяртаем увагу на абсалютна непразрысты і пазасудовы характар прыняцця Мінінфармам рашэнняў аб блакіроўцы сайтаў.

Патрабуем ад Міністэрства інфармацыі адмяніць рашэнне аб блакіроўцы і аднавіць свабодны доступ да грамадска-палітычных сайтаў charter97.org, belaruspartisan.org.

(Прынята праўленнем ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" 25 студзеня 2018 года.)

НАЦИОНАЛЬНАЯ ПРОБЛЕМА

ДЕГРАДАЦИЯ

Климовичский район расположен на юго-востоке Могилевской области. Граничит с Чериковским, Кричевским, Костюковичским, Краснопольским, Хотимским районами Могилевской области, а также с Ершичским и Шумячским районами Смоленской области Российской Федерации. Какие социальные, экономические и другие процессы происходят в этой приграничной провинции?

Демография и миграция

Для начала подчеркнем, что Климовичский и остальные районы в этой части Беларуси объединены не только общими границами и территорией. Напомним, что в 2015 году Александр Лукашенко подписал указ №235 «О социально-экономическом развитии юго-восточного региона Могилевской области». Документ был принят в целях устойчивого развития Климовичского, Костюковичского, Краснопольского, Кричевского, Славгородского, Хотимского и Чериковского районов. Таким образом, было официально признано, что ряд районов на юго-востоке страны нуждается в особых условиях, а регион уже не в состоянии самостоятельно развиваться.

Особенно убедительно это демонстрируют демографические сведения о сокращении населения Климовичского района за последние 20 лет. По результатам республиканской переписи 1999 года в Климовичском районе проживало 34.087 человек, городское население составляло – 17.072 чел., сельское – 17.015 человек. Как видим, на селе тогда проживала половина населения района.

Через десять лет, по состоянию на октябрь 2009 года, численность населения составляла уже 28.487 человек. В городе количество жителей осталось на том же уровне – 17.031 человек. А вот в сельских населенных пунктах проживало гораздо меньше людей (11.456 человек), так как тысячи сельских жителей перебрались в город или вообще за пределы района.

В дальнейшем миграционная волна ежегодно вымывала из Климовичей все более заметное число жителей. В качестве доказательства сошлемся на официальный документ. В марте 2012 года Климовичский райсовет утвердил «Программу демографической безопасности Климовичского района на 2011–2015 годы». В Программе констатировалось: *«Продолжает уменьшаться численность населения Климовичского района за счет миграционного оттока, который за 2007–2010 годы составил 1,5 тысячи человек»*.

Таким образом, уже тогда массовое переселение климовчан наносило серьезный демографический ущерб и снижало возможности для воспроизводства населения района. За последующие годы положение только ухудшилось, высокая смертность и отрицательная миграция привели к тому, что сейчас в Климовичском районе проживают уже меньше 25 тысяч человек (на январь 2017 г. – 24.871 чел.). К тому же с каждым годом в районе остается все меньше молодежи и становится все больше людей пожилого возраста. Так, на начало 2014 года числилось 7473 пенсионера, что составляло 28% в структуре местного населения, на конец 2015 года – 7762 чел. (30,2%).

Сельская местность

По-настоящему угрожающей следует назвать депопуляцию в сельской местности. Если еще в 2009 году в сельских населенных пунктах проживало 11.456 человек, или 40% от общей численности населения района, то теперь положение просто катастрофическое. На начало 2014 года на селе жило 9746 чел., на начало 2015 г. – 9287 чел., на начало 2016 г. – 8835 чел., на начало 2017 г. – 8525 человек. В 2015 году климовичская районная газета «Родная ніва» сообщала, что в каждой третьей деревне района (в 54 из 141) живет менее 10 человек. Всего же *«в сельских населенных пунктах насчитывается 4999 домовладений, из них 3722 – заселено, 1277 жилых домов, т. е. 25,5% от общего количества, признаны пустующими»*. Ввиду того, что с каждым годом в сельской местности остается все меньше жителей, это приводит к исчезновению деревень и даже сельсоветов. Уже ликвидированы Высоковский и Лозовицкий сельсоветы, а из оставшихся 8 сельсоветов района три находятся в стадии ликвидации, что предполагается осуществить в 2018 году после проведения выборов в местные Советы.

В результате негативных демографических процессов в последние годы в сельской местности ежегодно закрываются школы. Были ликвидированы школы в Павловичах, Судилах, Осмоловичах, Гусарке, Высоком и других деревнях. Это привело к тому, что в настоящее время для подвозки сельских учащихся от места жительства к месту учебы и обратно в районе используются 9 школьных автобусов, осуществляется подвоз 300 детей из 45 населенных пунктов.

Сегодня в сельской местности многие люди пожилого возраста не имеют родственников, поэтому в Климовичском районе *«задумались о создании деревни для одиноких пенсионеров»*. По информации, обнародованной на портале «СБ. Беларусь Сегодня», с этой целью хотят *«выбрать населенный пункт с большим количеством пустующих домов, отремонтировать их и заселять на зиму одиноких людей. Чтобы жили они рядом, оперативно получали социальную и медицинскую помощь»*. Реализация такого проекта позволит хотя бы частично снизить остроту социально-демографических проблем Климовичского района.

Трудовые ресурсы

Высокая смертность, низкая рождаемость и массовое переселение за пределы района чрезвычайно ослабили трудоресурсный потенциал Климовичского района. Тем более что трудовые ресурсы уменьшаются не только в силу естественной убыли населения, но и по причине значительного сокращения коллективов в организациях и предприятиях района. Как свидетельствуют статистические данные, в 2014 году в экономике района было занято 11 тысяч чел., в конце 2015 года – 10,6 тыс. чел., в мае 2016 года – 10,3 тыс. чел., в мае 2017 года – 9,9 тыс. человек. Ежегодное сокращение рабочих мест и отсутствие возможностей для трудоустройства, по сути, стимулируют выезд сотен и тысяч рабочих рук из Климовичей.

Отдельного рассмотрения заслуживает рынок рабочей силы и анализ безработицы в районе. Согласно официальным данным, количество безработных в Климовичах является мизерным. Главное статистическое управление Могилевской области извещает, что уровень зарегистрированной безработицы в Климовичском районе на конец июня 2017 г. составил 1% от численности рабочей силы (на конец июня 2016 г. – 1,1%).

Даже самое поверхностное знакомство с реальным положением дел быстро убеждает, что официальные проценты совершенно не отражают настоящего количества безработных.

Начнем с того, что за последние годы сотни климовчан потеряли работу в результате сокращения рабочих мест или увольнения в связи с закрытием предприятий. Для примера назовем закрытие Михалинского спиртзавода Климовичского ЛВЗ, на котором работало около 100 человек, или ликвидацию ДУКП «Жилком», где в свое время трудилось более 200 человек. Также значительные сокращения произошли во всех основных организациях города и района.

Куда же трудоустроились все эти люди? Можно уверенно предположить, что очень многие из них не смогли найти другую работу. По обнародованной информации Климовичского райисполкома, «за 2016 год трудоустроено 67 граждан на вновь создаваемые рабочие места» (районная газета «Родная ніва» – 18.03.2017). Как видим, создавалось примерно по 6 новых рабочих мест в месяц. Разумеется, это никоим образом не может удовлетворить потребности местного рынка рабочей силы, ведь безработных климовчан многократно больше. Во всяком случае еще два года назад, в августе 2015 года, в республиканской газете «Звязда» была названа цифра – 1400 нигде не работающих жителей Климовичского района. Очевидно, что с тех пор количество таких людей только увеличилось, так как за это время число занятых в экономике района уменьшилось как минимум на 700 человек.

Жилищное строительство

В 2007 году в Климовичском районе было построено 10,5 тыс. кв. м жилья, в 2008-м – 14,9 тыс. кв. м, в 2009-м – 15,2 тыс. кв. м, в 2010-м – 20,2 тыс. кв. метров. После 2010 года, когда экономику страны обрушил финансовый кризис, объемы жилищного строительства в Климовичах снизились. В 2011 году было сдано в эксплуатацию 15,3 тыс. кв. м жилья. В следующем 2012-м – всего 6,2 тыс. кв. м, что возвратило район на уровень 2005 года. В 2013-м году смогли построить лишь 4,8 тыс. кв. м, в 2014-м и вовсе только 3 тыс. кв. метров. В итоге за каких-то несколько лет объемы жилищного строительства в районе сократились по сравнению с 2010 годом почти в семь раз!

В 2015 году положение несколько изменилось к лучшему, было построено 6,4 тыс. кв. м общей площади жилых домов, в 2016 году – 8,8 тыс. кв. метров. Наблюдается определенный рост, но решению жилищных проблем климовчан это не очень помогает. Показательно, что очередь на жилье почти не сокращается. Уместно напомнить, что в 2008 году в Климовичском районе в очереди стояло 759 человек (семей). В то время такое положение официально признавалось сложным: *«Жилищная проблема в районе остается сложной, значительная часть населения состоит на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий»* (районная газета «Родная ніва» – 15.10.2008).

Спустя годы очередников стало еще больше. На 1 января 2014 г. в Климовичском районе в очереди на жилье стояло 938 чел., на 1 января 2015-го – 984 чел., на 1 января 2016-го – 1015 чел., на 1 января 2017-го – 952 человека. Количество нуждающихся в улучшении жилищных условий не уменьшается по ряду причин. Это падение строительства жилья, старение жилищного фонда (много домов старше 30 лет), периодическое добавление в очередь новых очередников (например, многодетные семьи) и лиц из числа льготных и иных категорий. Так, на начало 2017 г. в районе на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий стояло 110 детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Нереализованные планы

В связи с вышесказанным хочется напомнить, что относительно недавно в Климовичах разрабатывали масштабные планы по преобразованию центральной части города и его окрестностей. Они были вывешены на всеобщее обозрение в Климовичском райисполкоме и в городских учреждениях. Детальный план предусматривал обширную застройку центра и окраин города. Только вот оказалось, что сбыться этим планам не суждено.

И это не единственный строительный проект, который не удалось реализовать в Климовичах. Например, было законсервировано строительство физкультурно-оздоровительного комплекса, приуроченное к президентским выборам-2010. Перед выборами климовчанам сообщалось, что «готовится стройплощадка под физкультурно-оздоровительный комплекс, который планируется ввести в эксплуатацию в следующем году». Но в 2011 году все работы на объекте прекратили, а строительство завершилось на стадии фундамента.

Или еще один красноречивый пример. В Климовичах уже много лет собираются построить новый районный центр культуры. В связи с Программой социально-экономического развития юго-восточных районов Могилевской области о данном проекте вспомнили вновь. В январе 2016 года в районной газете писали: «Символично, что в Год культуры в Климовичах начнется реконструкция районного центра культуры. Первая очередь – возведение библиотеки». Год культуры давно закончился, но про реконструкцию и возведение ничего не слышно. Зато за прошедшее с тех пор время в районе были закрыты две сельские школы, городской кинотеатр, четыре сельских клуба культуры и библиотека.

Социальные проблемы

Кратко остановимся на проблемах социального характера. В последние годы в белорусском обществе получили широкое распространение такие негативные социальные явления, как алкоголизм, наркомания, распад семейно-брачных отношений. Например, по информации Национального статистического комитета Беларуси, в 2016 году в среднем по стране на каждую тысячу заключенных браков приходилось 506 разводов. В связи с этим нельзя не отметить, что Климовичский район отличается одним из самых высоких уровней разводов в Беларуси. Здесь зафиксировано 623 развода на 1000 свадеб, фактически это означает, что распадается каждый второй брак. Примечательно, что в 2016 году в рейтинге разводов Климовичский район находился на 7-м месте среди 118 районов страны.

После 2010 года в Климовичском районе стало стремительно расти количество местных жителей с диагнозом ВИЧ. Количество ВИЧ-инфицированных за последние годы увеличилось в три раза. Если на 1 января 2011 года в районе было 9 человек с таким диагнозом, то по данным на 1 апреля 2017 года в районе зарегистрировано 29 ВИЧ-инфицированных климовчан (районная газета «Родная ніва» – 17.05.2017).

Одновременно в Климовичском районе фиксируется значительный рост наркопреступлений. Несколько лет назад раскрывалось от 2 до 5 преступлений в год. За первое полугодие 2017 года по линии наркоконтроля и противодействия торговле людьми задокументировано 20 преступлений, что на 300% больше, чем за аналогичный период 2016 года, из них 5 тяжких и особо тяжких преступлений.

Выводы

Подводя итоги, отметим, что отрицательную характеристику Климовичского района подтверждает среди прочего публичное утверждение Александра Лукашенко, заявившего в ходе посещения Климовичей в апреле 2014 года, что *«здесь, по моим данным, все валится»* (цитата БЕЛТА). Тогда в поисках выхода из сложившейся ситуации предлагалось даже объединить Климовичский район с Хотимским, но пойти на административно-территориальный эксперимент, к счастью, не решились. А через год появился указ №235 «О социально-экономическом развитии юго-восточного региона Могилевской области». Но принятие этого документа, судя по вышеперечисленным фактам, не очень повлияло на улучшение положения как региона в целом, так и Климовичского района в частности.

Стагнация белорусских приграничных территорий в этой части страны продолжается, они стремительно теряют свой демографический потенциал, трудовые ресурсы и производственную инфраструктуру. Неудивительно, что среди населения усиливаются пророссийские взгляды и предпочтения, которые и без того являются традиционными для белорусско-российского приграничья. И дальнейшее ухудшение социально-экономической ситуации в регионе будет делать выбор в пользу восточного соседа Беларуси еще более притягательным и оправданным в глазах местных жителей. Не стоит объяснять, особенно после трагических событий в Украине, что игнорирование подобных умонастроений может привести к непредсказуемым последствиям в государственном масштабе.

(Belarus Security Blog.)

Народная Воля http://www.nv-online.info 26 СТУДЗЕНЯ 2018 г.

Калонка Міхася СКОБЛЫ

Ганаровая мова

Для замежных беларусаў мінскае метро – як бальзам на сэрца. Дакладней, моўны рэжым, які існуе ў нашай падземцы. Прыязджае змучаны настальгіяй чалавек на радзіму, спускаецца па эскалатары, а тут табе: "Асцярожна, дзверы зачыняюцца. Наступная станцыя – "Кастрычніцкая". Ды яшчэ тое самае па-англійску. Песня песняў, а не метро. Памятаю, з якім замілаваннем прыслухоўваўся да абвестак у вагоне адзін мой маскоўскі знаёмец родам з мінскіх ваколіц. Ужо і просьба прагучала "Калі ласка, пакіньце вагоны", і праведніца, падобная на сцюардэсу, па пустым цягніку пайшла, а ён усё сядзеў у тым вагоне, быццам апошняя станцыя не "Магілёўская", а дзесьці ў Шабанах ці ў яго ным родным Чэрвені-Ігумене.

Тады ж маскоўскі беларус (між іншым, доктар навук) назваў мінскае метро ганаровым прытулкам беларускай мовы. Адразу набеглі асацыяцыі з домам-прытулкам для заслужаных пенсіянераў, з падзямеллямі, дзе хаваліся першыя хрысціяне. Але ж мова – не пенсіянер і не зацкаваны львамі хрысціянін, навошта ёй прытулак пад зямлёй, хай сабе і ганаровы?

А калі на зямлі няўтульна, калі ў дзіцячым садку месца няма, калі са школы амаль выжылі, калі ў незалежнай краіне няма ніводнай беларускамоўнай ВНУ, калі ва ўладных кабінетах пануе другая мова, то куды ёй, першай, падзецца? Толькі пад зямлю. Перачакаць неспрыяльны час у тым ганаровым прытулку, паперагуквацца з мовай англійскай у доўгіх і змрачнаватых па начах тунэлях.

Праўда, як высветлілася, і на зямной паверхні ў беларускай мовы ёсць не менш пашанотны прытулак. Нават пад узброенай аховай. Гэта рота ганаровай варты, якая абслугоўвае розныя пратакольныя мерапрыемствы. Як прызнаўся нядаўна адказны за ідэалогію ў войску генерал Аляксандр Гура, з мовай там поўны парадак – цэлай роце (ды якой – ганаровай!) дадзена каманда рапартаваць па-беларуску. Што ж, без каманды, як вядома, войска гіне. І ганаровая рота старанна спраўляецца з аказаным ёй гонарам – перад ганаровымі гасцямі прэзентуе ганаровую мову. Бо як інакш яе назваць, калі яе не чуваць ні ў Генеральным штабе, ні ў казарме, калі ёю не карыстаюцца на занятках па баявой і палітычнай падрыхтоўцы, калі яе падкрэслена ігнаруе галоўнакамандуючы, калі на ёй не выдаюцца статуты?

Зрэшты, тут неабходна зрабіць агаворку. У 2010 годзе агульнавайсковы статут выйшаў і па-беларуску. Накладам ажно 350 асобнікаў. Чаму так мала? Ды таму, што для звычайных вайскоўцаў ён і не прызначаўся – толькі для тае самае роты ганаровай варты. Дарэчы, перамяшчаецца яна па краіне на адмысловым аўтобусе, на бакавіне якога паўметровымі літарамі напісана – *Ганаровая варта*, а ў тым, выдадзеным па-беларуску, статуце – *ганаровы каравул*. Не шкодзіла б выправіць памылку. Ды, баюся, калі возьмуцца "выпраўляць", то зробяць гэта хутчэй [illegible]

[illegible]

Але ўсё роўна і няўзброеным вокам відно – "мочаць пакаухуу".

«Народная Воля» сообщила, что за 11 месяцев 2017 года минские безбилетники выплатили штрафы на сумму полмиллиона долларов. Это результат работы «бойцов невидимого фронта» – контролеров «Минсктранса». Партизанская терминология тут вполне уместна: контролеры работают без форменной одежды, им помогают добровольные дружинники. Правда, вместо маузеров и автоматов у них на вооружении видеорегистраторы.

РЕЗОНАНС

«Дикая охота» на блох

Полмиллиона долларов – звучит очень весомо (хотя все расчеты в Республике Беларусь производятся в рублях). Приятно вообразить такую сумму в руках рядового гражданина из соседнего подъезда – может, перестанет клянчить денежку на выпивку? Ну а что получает государство от добычи охотников на «зайцев»? Давайте посчитаем, используя приведенные в статье сведения (в тех денежных единицах, которые использовал «Минсктранс» в своей информации).

Под землей «зайцы» не водятся – в метро без оплаты не проедешь, а на наземном транспорте минчане совершают около 1.300.000 поездок в день и за это ежедневно выкладывают около 400.000 долларов, или 12 миллионов за месяц. Сумма штрафа около 6 долларов (11,5 рубля) – в 20 раз больше стоимости проезда, ежедневно отлавливают примерно 250 «зайцев», которые выплачивают штраф на сумму около 1500 долларов. За месяц – 7500 человек и 45.000 долларов штрафов. К слову, если бы 7500 пассажиров своевременно оплатили проезд, то «Минсктранс» получил бы всего 2250 долларов.

Средняя зарплата контролеров составляет 310 долларов (620 рублей, такая сумма указана в объявлениях о вакансиях) в месяц. Согласно данным начальника контрольно-ревизорской службы государственного предприятия «Минсктранс» Юрия Давидовича, штат контрольно-ревизионной службы – 220 человек, значит, на их зарплату требуется 68.200 долларов. То есть полученных за месяц штрафов на зарплату контролеров не хватает.

Подведем итоги. Польза от новой системы оплаты проезда, настойчиво внедряемой «Минсктрансом», такая же, как от ловли блох. Вылавливая из каждых 5000 пассажиров 1 зайца, контролеры не оправдывают затраты на организацию своей работы. Мало кто знает, что электронные компостеры (валидаторы) стоят около 700 долларов за штуку, и в каждом троллейбусе или автобусе их установлено от 6 до 11 штук. А ведь затраты на их обслуживание тоже стоят немалых денег…

При советской власти за сумму, необходимую на покупку трех талончиков на городской транспорт, можно было купить пол-литра молока. Сегодня за цену пол-литра молока проедешь всего раз. Очень многим пассажирам сегодня такая арифметика до боли знакома, особенно пенсионерам.

Идут разговоры об очередном повышении платы за проезд. Неужели для того, чтобы мы оплатили еще одну затею вроде нынешнего «дзікага палявання»?..

Михаил ЗАПОЛЬСКИЙ, пенсионер.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

«Электронны прагрэс і канфлікты ў садовых таварыствах»

1 снежня 2017 года ў "Народнай Волі" былі надрукаваны мае нататкі пад назвай "Электронны прагрэс і канфлікты ў садовых таварыствах". Я стаўлю пытанне: ці правамерна без сістэматычнага кантролю ўнутрыдамавых індукцыйных лічыльнікаў і без доказу фактаў крадзяжу прымушаць членаў СТ замяняць індукцыйныя прыборы на электронныя і выносіць іх на апоры ЛЭП.

На публікацыю адгукнулася шмат чытачоў тэлефоннымі званкамі і электроннымі лістамі. Адказваю толькі на крытычныя заўвагі.

На думку трох чытачоў (прасілі не называць сябе, што мяне, шчыра кажучы, здзіўляе), развагі аўтара публікацыі не даведзены да лагічнага канца: *няма прававой ацэнкі дзеянняў старшыні і праўлення*. Адказ: я наўмысна [illegible]

…крадзеж. Толькі выбраў не лепшы метад – публічны падман і пагрозы. Той жа судовы эксперт мог бы таксама *кваліфікаваць дзейнасць (дакладней – бяздзейнасць) старшыні ў пытанні выяўлення прычын павышэння страты электраэнергіі як невыкананне службовых абавязкаў*, бо гэта зафіксавана ў раздзеле статута СТ "Правы і абавязкі старшыні".

Два члены нашага таварыства, зноў жа не называючы сябе, заўважылі, што мною ***аспрэчваецца відавочны факт, што паводле статута СТ рашэнне агульнага сходу з'яўляецца абавязковым для выканання ўсімі членамі таварыства***. Гэта адносна таго, што я аспрэчваю паўнамоцнасць рашэння чацвёртага, паўторнага, агульнага сходу (правамоцны нават пры ¼ асабовага складу), дзе была прагаласавана прапанова вынесці лічыльнікі на слупы і зрабіць дадат[illegible]

…**лічыльнікаў**, не патрабаваў планавай здачы ў РУП "Мінскэнерга", не звяртаў увагі на ўчасткі з вялікім спажываннем энергіі. Яна даслоўна заўважыла: *"Мне здаецца, што гэтая неразбярыха (яна ўжыла больш моцнае слоўца) была камусьці выгадна. Кіраўніцтва, як энергазабеспячальная арганізацыя, цяпер ужо стала не проста транзіцёрам ад "Энергазбыту", не фармальным забеспячэнцам, а сапраўдным прадаўцом. Вось у нас цяпер пачалі збіраць грошы на нейкія страты, чаго раней не было. І ўсім спажыўцам "выкацілі" прэзумпцыю вінаватасці ў крадзяжы"*.

Сапраўды, нельга без належнага кантролю прыняць сцвярджэнне, што галоўныя прычыны страт – індукцыйныя лічыльнікі. На ўсіх жа сходах гэта падавалася як аксіёма. Гаварылася як бы ад імя дзяржавы: цяпер такое патрабаванне! (Пра тое, што патрабаванне тычыц[illegible]

…***захавання ўласнасці грамадзян, якое пацвярджаецца Грамадзянскім кодэксам РБ***. На жаль, я пра гэта нічога не пісаў. Сапраўды, хто можа гарантаваць захаванне дарагой рэчы ў чыстым полі? У нашым СТ няма і па сённяшні час адзінкі вартаўніка (хаця ёсць, праўда, адзінка газонакасільшчыка). Доступ на тэрыторыю свабодны. Ды і што можа "вартаўнік з дубальтоўкай", хай сабе і пры штодзённым візуальным кантролі тэрыторыі СТ? Для дэмантажу скрынкі з лічыльнікам злачынцу спатрэбіцца хвілін дзесяць, гаечны ключ, рэзальны інструмент ды гумовыя пальчаткі. І адна ці дзве асобы "на шухеры". Калі "Мінскэнерга" і "Энергазбыт" прымалі ў 2010 годзе пастанову аб "Тэхнічных патрабаваннях да ўліковага разліку электраэнергіі" на капітальных будоўлях і нагадвалі пра магчы[illegible]

…дзядзьку, што павесіць вам на слупы невядома што. Чаму маўчалі члены праўлення і рэвізійная камісія? Няўжо яны не бачылі, што старшыня пачаў сваю "акцыю" з публічнага падману і запалохвання адключыць непаслухмяным электрычнасць? Людзі нашы – цярплівыя і сарамлівыя: ай, неяк няёмка пытацца, высвятляць дробязі, што колькі каштуе, хто аказваў паслугу, няхай будзе, як ёсць…

Публічнасць – сродак ад сорому і крыўдаў. Кожнае кіраўніцтва садовага таварыства, складаючы паўнамоцтвы, павінна пакінуць пасля сябе ўпарадкаваную "папяровую" гаспадарку: дакумент аб стварэнні СТ як юрыдычнай асобы, тэкст статута, генеральны план забудовы, сведчанні ўліку нерухомай маёмасці, план сістэмы электра- і водазабеспячэння, дадзеныя пра фінансавыя сродкі і банкаўскія [illegible]

[illegible]

Можа, ён сапраўды, паводле свайго разумення, хацеў усё зрабіць як найлепш, будучы ўпэўнены, як энергетык паводле адукацыі, што галоўная прычына высокіх энергастрат – індукцыйныя лічыльнікі і [illegible] гледжваецца нашым статутам.

Адна пенсіянерка з нашага садовага таварыства заўважыла ў тэлефоннай размове, што **і пры ранейшых старшынях ніхто ніколі не займаўся сістэматычнай праверкай** [illegible]

Член нашага СТ "Бярозка-Мотавела" заўважае, што ў ***артыкуле нічога не гаворыцца пра фактар рызыкі ўсталявання на вуліцы нятаннай электроннай апаратуры і пра адсутнасць гарантыі*** [illegible]

[illegible] былі раней. Ці ж нельга было ўсё зрабіць па-людску? Здаваць рэгулярна і арганізавана на кантроль і замену старыя індукцыйныя лічыльнікі ў дзяржаўныя майстэрні, а не давярацца нейкаму добраму [illegible] павінен быў бы мець і прыбор кантролю электрафізічных характарыстык лічыльнікаў. Выдаткі акупіліся б з цягам часу.

Пётр САДОЎСКІ, пенсіянер.
Мінск.

ПРОЩАЛЬНЫЕ СЛОВА

Другое измерение Михаила Анемподистова

24 января в Минске умер Михаил Анемподистов – известный дизайнер, график, поэт и исследователь белорусской культуры. Он родился 16 марта 1964 года в Минске. Окончил художественный колледж имени Глебова. В изобразительном искусстве работал в основном в жанрах графики и плаката.
Его работы экспонировались на персональных выставках в Беларуси, Германии, Дании, Польше, Украине. Анемподистов – автор логотипов общественно-культурной кампании «Будзьма беларусамі!», рок-фестивалей «Басовішча» 2007-го и 2008 годов, обложек для альбомов белорусских групп N.R.M., «Партызанская школа», Змитера Войтюшкевича. Михаил Анемподистов – один из наиболее активных создателей белорусской рок-поэзии. Ему принадлежат идея и тексты культового белорусскоязычного рок-мюзикла «Народны альбом». Песни на его стихи исполняют группы «Новае неба», IQ48, N.R.M., бард Кася Камоцкая.

Миша, дорогой Миша… Друг детства…

Второй класс. Мы у Миши дома. Он навырезал пару сотен маленьких бумажных кружочков диаметром в сантиметр, все – разных цветов. Мы с ним сортируем их в цветовую гамму. Понимаем, что одного измерения – по семи цветам радуги – недостаточно, надо добавить хотя бы еще измерение от светлых тонов к темным, и все равно некоторые кружочки не вписываются.

Третий класс. Миша объясняет мне, как надо тренировать глаза, чтобы не прогрессировала близорукость. Много лет спустя я все еще делаю эти упражнения иногда. Фокусирую взгляд на предметах близких, подальше и совсем далеко – смотришь в одном направлении, но разворачивается целое измерение в нем.

Четвертый класс. Мы с Мишей делаем стенгазету у меня дома. Родители ушли куда-то в гости. Раскрашиваем фломастерами, но они почти высохли. «Если налить во фломастер одеколона, то он еще будет работать», – авторитетно говорит Миша. Ищем одеколон. Находим французские духи моей мамы. Заливаем – работает! Стенгазета успешно завершена. Но полфлакона «Шанели № 5» израсходовано, и я начинаю понимать, что мне за это влетит. Мы решаем подлить «другие духи», чтобы не было заметно. Идем в «Военторг», покупаем за 30 копеек маленький флакончик самого дешевого одеколона, вливаем его во французский дефицит. Почему мы не купили его для фломастеров? На следующий день одноклассницы с интересом обнюхивают нашу стенгазету – содержание и оформление оказываются не главными ее эффектами. Ольфакторное – обонятельное – измерение прибавилось! Но «Шанель» безвозвратно обесчещена военторговским хамским «Шипром», и мне за это, конечно, влетает.

Пятый класс. Мы делаем лягушек-оригами и устраиваем соревнования. Мои лягушки прыгают дальше, но Миша придумывает, как сделать их разноцветными, если использовать бумагу из журналов. Добавляет к длине и высоте прыжка эстетическое измерение.

Талантливый, умный человек – он был для меня лицом современной белорусской культуры. Спасибо тебе, Миша! За воспоминания, за игры, за дружбу, за детские ссоры, за искренность, за серьезные разговоры. За новые измерения. Ты не изменил себе – ушел в другое измерение, которое нам пока не понять.

Андрей ЗАНЕВСКИЙ, программист (Чикаго).

Народная Воля http://www.nv-online.info 26 СТУДЗЕНЯ 2018 г.

КТО ЕСТЬ КТО

Сенат США утвердил «главнокомандующего долларом»

Трамп и Пауэлл.

Сенат Соединенных Штатов Америки окончательно утвердил на посту председателя Совета управляющих Федеральной резервной службы (ФРС) США кандидатуру выдвинутого президентом Дональдом Трампом **Джерома Пауэлла**. За него проголосовало 85 сенаторов, против – 13. Среди голосовавших против – четверо республиканцев, восемь демократов и независимый сенатор Берни Сандерс (бывший конкурент Хиллари Клинтон при выдвижении кандидатом в президенты США).

Федеральная резервная служба США была создана в 1913 году. Она объединяет 12 федеральных резервных банков США и контролирует инфляцию доллара с целью предупреждения кризисов и содействия максимальной занятости населения в стране. Таким образом, решения ФРС прямо или косвенно затрагивают интересы всего человечества: доллар входит в число резервных валют большинства банковских систем мира. Срок полномочий председателя Совета управляющих – четыре года, причем одно и то же лицо не вправе занимать этот пост свыше двух сроков. Предшественница Пауэлла, первая женщина на посту главы ФРС Джаннет Йеллен, отбыла один срок и не намеревалась продолжать карьеру.

Джерому Пауэллу 64 года. Он – профессиональный юрист, член Совета управляющих ФРС с мая 2012 года, член Республиканской партии. Также он самый богатый глава ведомства, начиная с 1948 года. Кроме того, Пауэлл – первый за последние тридцать лет председатель Совета управляющих ФРС, не имеющий докторской степени по экономике, однако его кандидатура в ноябре при обсуждении на профильном комитете Сената получила всего один голос «против». Сказался его опыт и предложенная программа действий.

По мнению авторитетнейшей газеты «The Financial Times», Пауэлл приложит все усилия, чтобы сохранить стабильность доллара – в том числе подготовит почву для дальнейшего повышения процентных ставок. Несмотря на то, что его кандидатура была выдвинута президентом Трампом, Пауэлл пообещал максимально содействовать сохранению независимости ФРС, содействовать стабилизации цен и открытию новых рабочих мест.

КАМЕНТАРЫЙ

Сірыйскі вузел зацягваюць курды

Першы месяц 2018 года стаў пачаткам новага этапу развіцця канфлікту вакол Сірыі. Людзям, якія назіраюць за ім здалёк, цяжка зразумець, што там насамрэч адбываецца: чаму, напрыклад, Турцыя раптам стала паплечніцай Расіі і супрацьстаіць Злучаным Штатам Амерыкі? Усё ж было добра, усе ж змагаліся супраць так званай Ісламскай Дзяржавы – і раптам…

Так, ІДІЛ быў пераможаны. Але ж ягоныя прыхільнікі атрымалі магчымасць сысці з "катла" і знікнуць недзе на абшарах Бліжняга Усходу. І вайна працягнулася. Ужо не супраць ІДІЛ альбо нават Башара Асада. Супраць курдаў.

Курды – буйны народ, які не мае сёння ўласнай дзяржавы. Найбольшыя групы курдаў жывуць на тэрыторыях Ірака, Сірыі і Турцыі. Пакуль блізкаўсходнія свецкія рэжымы былі моцныя, яны стрымлівалі імкненне курдаў аб'яднацца і стварыць уласную дзяржаву Курдыстан, бо стварыць яго насамрэч можна было б толькі за кошт разбурэння ўжо існуючых дзяржаў. Калі абрынуўся рэжым Садама Хусейна, курды падчас свабодных выбараў атрымалі перамогу ў тых правінцыях Ірака, дзе жылі, стварылі моцную парламенцкую фракцыю. І нават парламент Ірака ўзначаліў прадстаўнік курдаў. Але ж пра стварэнне ўласнай дзяржавы іракскія курды пакуль не ставілі пытанне рубам: іх цалкам задавальняла тая аўтаномія, якую яны атрымалі ў Іраку.

Сітуацыя змянілася пасля таго, як пачалося ваеннае змаганне з ІДІЛ. У сітуацыі, калі Злучаныя Штаты не хацелі абаперціся на рэжым Башара Асада, сірыйскія і іракскія курды, якія прывыклі змагацца з урадавымі вайскамі, сталі фактычна аднымі з найбольш моцных хаўруснікаў ЗША ў рэгіёне. Ніхто дагэтуль не сказаў, што паабяцала курдам амерыканскае кіраўніцтва, але ж можна здагадацца. Тым больш што цэласнасць асадаўскай Сірыі не вельмі цікавіла Вашынгтон.

Але ж сама думка пра стварэнне незалежнага Курдыстана стала падставай для канфлікту паміж Турцыяй і Злучанымі Штатамі. Зразумела, Турцыя не збіралася і не збіраецца выходзіць з НАТА, а тым больш уступаць у нейкія ваенныя канфлікты з Амерыкай. Але ж Курдыстан ёй не патрэбны. Дастаткова сказаць, што найбольш вядомы палітык-курд Абдула Аджалан па абвінавачанні ў стварэнні тэрарыстычнай арганізацыі адбывае ў Турцыі пажыццёвае турэмнае зняволенне. Нават заклікі Аджалана да пераходу ад збройнага супрацьстаяння да палітычнай барацьбы не змянілі стаўлення турэцкай дзяржавы да яго.

Так курды зацягнулі вузел: з апанента рэжыму Асада і Расіі прэзідэнт Турцыі Раджэп Эрдаган быў прымушаны ператварыцца ў іх паплечніка. Пачаліся перамовы наконт правядзення міжнароднай канферэнцыі па Сірыі, якая, як вядома, пачне сваю працу ў расійскім горадзе Сочы 30 студзеня. Гарантаваны таксама ўдзел Ірана, які зусім не зацікаўлены ва ўзмацненні ў рэгіёне пазіцый ЗША, якое адбудзецца пасля легалізацыі дзяржаўных амбіцый курдаў.

Зразумела: ёсць пэўнае супярэчанне паміж дзвюма фундаментальнымі прававымі нормамі сённяшняга міжнароднага заканадаўства. З аднаго боку, нацыі маюць права на самавызначэнне і стварэнне ўласнай дзяржавы. Але ж і дзяржава мае права ахоўваць сваю цэласнасць і свае межы – гэта яе абавязак у адносінах да свайго народа. Пытанне зараз не ў тым, ці падабаецца камусьці Башар Асад або не, пытанне ў тым, ці будзе створаны прэцэдэнт, калі пад ціскам Злучаных Штатаў сірыйскія курды легальна атрымаюць шанц стварыць уласную дзяржаву за кошт разбурэння сірыйскай. Гэта можа стаць тым дадатковым градусам у блізкаўсходнім вогнішчы, які ўзарве кацёл ужо канчаткова.

Канешне, Масква выкарыстоўвае гэтую нагоду, каб замацавацца на Блізкім Усходзе. І выкарыстае абавязкова. Але ж цалкам магчыма, што гэта стане той саступкай, якая дазволіць пазбегнуць яшчэ больш крывавых падзей у рэгіёне. Бо зразумела: Турцыя будзе бараніць сваю цэласнасць са зброяй у руках.

Фёдар КАНСТАНЦІНАЎ.

ТАМ, У ВАРШАВЕ…

Затрымліваюць палякаў, якія святкавалі дзень народзінаў Гітлера

Пасля таго як у мінулую суботу адзін з польскіх тэлевізійных каналаў паказаў журналісцкае расследаванне аб дзейнасці неанацыстаў на тэрыторыі краіны, польскія спецслужбы хутка ўзяліся за працу. Менш за тыдзень былі затрыманы пяць асоб, якіх апазналі па фотаздымках, зробленых падчас святкавання 128-га дня народзінаў Адольфа Гітлера і прадэманстраваных па тэлебачанні. Сярод затрыманых – кіраўнікі аб'яднання "Duma i Nowoczesność" ("Гонар і сучаснасць"). У кватэрах затрыманых знойдзена фашысцкая сімволіка, форменная вопратка, сцягі. Адзін таксама абвінавачваецца ў незаконным валоданні зброяй. Усім ім інкрымінуецца прапаганда фашызму. Пракуратура пакуль не паведамляе, ці прызнаюць яны сваю віну.

Спецыяльныя службы таксама паведамілі, што вывучаюць дзейнасць шэрагу іншых арганізацый, звязаных па меншай меры з двума фестывалямі – "Фестывалем ідэнтычнасці" і "Арлiным гняздом". На іх правядзенне збіраліся грошы з ліку тых, што бізнес у межах аднаго працэнта мае магчымасць пералічваць на дабрачыннасць. Дакладна вядома пра дзве сумы: у 2015 годзе было сабрана 13 тысяч злотых, у мінулым годзе – 12 тысяч. Грошы невялікія, але ж…

Згодна з меркаваннем журналістаў, уздым нацысцкіх настрояў і рост колькасці арганізацый характэрны перш за ўсё для Сілезіі і з'яўляецца рэакцыяй неадаптаванай моладзі на вялікую колькасць мігрантаў, у тым ліку з краін былога СССР, якія, на думку маладых палякаў, адбіраюць у іх працу. Старэйшае пакаленне таксама незадаволена, але ж рэагуе менш імпульсіўна.

Як высветлілася пазней, у фільм не быў уключаны яшчэ адзін эпізод: неанацысты заклікалі ў ім забіць былога польскага прэм'ер-міністра, а сёння – прэзідэнта Еўрапейскага Саюза Дональда Туска. Не вядома, чаму гэта сцэна не была паказана тэлегледачам. Магчыма, таму, што гэты заклік патрабуе дадатковых следчых дзеянняў. А магчыма, і таму, што Туск сёння з'яўляецца найбольш уплывовым апанентам дзеючага польскага ўрада, які, з пункту гледжання экс-прэм'ера, занадта нацыяналістычны.

ВІЛЬНЮС–МІНСК–МАСКВА

Літовец інсцэнізуе «Цынкавых хлопчыкаў» для Сакурава

Вядомы літоўскі драматург Марус Івашкявічус зробіць па просьбе зоркі сусветнага кінематографа – рэжысёра Аляксандра Сакурава – інсцэнізацыю кнігі "Цынкавыя хлопчыкі" першага беларускага набеліята Святланы Алексіевіч. Новая п'еса будзе пастаўлена Сакуравым у маскоўскім Тэатры Нацый, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца народны артыст Расіі Яўген Міронаў.

Сустрэча Івашкявічуса з Алексіевіч мусіла адбыцца ў Вільнюсе, але ж з-за хваробы пісьменніцы была адкладзена. Зараз чакаецца прыезд самога Івашкявічуса ў Мінск.

Марусу Івашкявічусу 44 гады. Ён узнагароджаны медалём ордэна "За заслугі перад Літвой"; яго творы перакладзены на шэраг еўрапейскіх моў, у тым ліку на беларускую, англійскую, французскую, італьянскую, польскую, рускую.

Івашкявічус вядомы таксама як грамадскі дзеяч. У 2016 годзе Літоўскае радыё абвясціла яго Чалавекам года Літвы за ягоную ініцыятыву: каля паўтысячы чалавек з Малетай, роднага мястэчка Івашкявічуса, прыйшлі на ягоны заклік да месца, дзе ў 1941 годзе былі забіты дзве тысячы яўрэяў, каб успомніць трагедыю Халакосту і папрасіць прабачэння.

У ДВУХ СКАЗАХ

***

Член Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Сулейман Керымаў вярнуўся з Расіі ў Францыю, дзе знаходзіцца пад крымінальным следствам: яго падазраюць у падатковым махлярстве. Францыя выпусціла яго на тры дні на радзіму, бо зразумела: куды ж мільярдэр уцячэ ад уласных грошай?

***

23 студзеня пачаў сваю працу чарговы Сусветны эканамічны форум у Давосе. Паколькі гэтым разам акцыі пратэсту антыглабалістаў у Давосе забаранілі, яны пройдуць у Цюрыху.

***

Спецыялізаваная антыкарупцыйная пракуратура Украіны паведаміла кіраўніцы Дзяржаўнай аўдытарскай службы краіны Лідзіі Гаўрылавай пра падазрэнне ў незаконным абагачэнні ў дачыненні да яе. Чыноўніцы інкрымінуецца незаконнае валоданне маёмасцю на 10 мільёнаў грывень, якія не былі своечасова задэклараваны.

***

У Галівудзе на Алее славы з'явілася зорка ў гонар Міні Мавус – жонкі славутага мышаняці Мікі Мавуса. Зоркай знакамітая мышка ўганаравана не толькі за кінематаграфічныя поспехі, але ж і за дабрачыннасць: за кожнае сэлфі ў сацыяльных сетках з вушамі, як у Міні і Мікі Мавусаў (так званая акцыя "Падаруй свае вушы!"), фірма "Дысней" пералічвала па 5 долараў у дабрачынны фонд, які выконваў пажаданні цяжка хворых дзетак, так што агулам было сабрана 4 мільёны долараў.

***

Першая ракетка свету іспанец Рафаэль Надаль атрымаў траўму і не здолеў дагуляць матч чвэрцьфіналу турніру Australian Open. Перамога залічана харвату Марыну Чылічу, які згуляе ў паўфінале з брытанцам Кайлам Эдзіундам.

***

Урад Польшчы прыняў праект пастановы аб супрацьдзеянні адмыву грошай і фінансаванню тэрарызму. Новыя юрыдычныя правілы яшчэ больш набліжаюць фінансавае заканадаўства Польшчы да законаў, якія рэгулююць фінансавую сферу ў Еўрапейскім Саюзе.

***

Міністры фінансаў краін Еўрасаюза выключылі з "чорнага спісу" афшораў восем краін і тэрыторый: Манголію, Барбадас, Гранаду, Туніс, Паўднёвую Карэю, Макаа, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, а таксама Панаму. Што зараз рабіць з паняццем "панама", якое стала вызначэннем махлярства і жульніцтва, лінгвісты не гавораць.

***

22 студзеня пачала працаваць папраўка да артыкула 19 закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" Таджыкістана. Зараз усе цэрквы, мячэці і сінагогі, а таксама рэлігійныя аб'яднанні будуць мусіць выплачваць падаткі.

***

На працягу бліжэйшых сямі гадоў літоўская гандлёвая сетка адмовяцца ад продажу найбольш танных яек. Справа ў тым, што танней за іншыя каштуюць яйкі, якія нясуць куры, што ўтрымліваюцца ў клетках, а гэта – негуманна.

100 ГАДОЎ ТАМУ…

Савецка-нямецкі хаўрус: вытокі і наступствы

Некалькі дзён таму магілёўскі гісторык-археолаг Ігар Марзалюк, які з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, падчас пасяджэння "круглага стала", што праводзіўся ў рэдакцыі газеты "Звязда", заявіў літаральна наступнае (цытую паводле афіцыйнага сайта): *"Нельзя только создателей БНР считать правопреемниками идей 1-го Всебелорусского съезда. Более того, демократического мандата и легитимной правопреемственности с Всебелорусским съездом Рада БНР на самом деле не имела, так как Всебелорусский съезд никогда требований независимости не озвучивал. Легитимным преемником и продолжателем идей Всебелорусского съезда был Белнацком. Да, съезд разогнали большевики Западного фронта, так как не хотели делиться властью с представителями белорусского народа. Но съезд сумел состояться и быть таким представительным именно потому, что большевистское центральное руководство, а точнее – лично Ленин и Сталин, поддержало его проведение"*.

Як на маю думку, чалавек з дыпломам гісторыка, а пагатоў – доктар навук, павінен умець глядзець на падзеі мінуўшчыны не ў адрыве ад іх шырокага кантэксту. Хоць я і не прафесійны гісторык, але дазволю сабе заўважыць, мякка кажучы, недахоп логікі ў вышэйпрыведзеным выказванні Ігара Марзалюка.

Па-першае, існуюць дакументы (і я іх цытаваў у папярэдніх публікацыях), якія сведчаць пра тое, што на згаданым з'ездзе пытанне незалежнасці Беларусі ўздымалася і даволі актыўна абмяркоўвалася. Па-другое, Ігар Марзалюк пярэчыць сам сабе: калі бальшавікі паважалі з'езд і яго ўдзельнікаў, то навошта яны гэты з'езд разганялі? Па-трэцяе, сучаснік тых падзей Фёдар Турук у сваёй не раз ужо намі згаданай раней працы "Белорусское движение" напісаў літаральна наступнае: *"Почти все белорусские национальные и партийные организации, в том числе и оставшийся после разгона съезда Совет Старейшин, объявивший себя 18 декабря* (1917 года паводле юліянскага календара. – **Л.Б.**) *исполнительным органом («Советом съезда»), имеющим право самопополнения делегатами от землячеств и других групп съезда, переходят на положение нелегального существования; всякое проявление белорусского движения берется под подозрение как реакционное, национал-шовинистическое"*. Пра якую "легітымную" дзейнасць на карысць беларускай справы і дзяржаўнасці (у тым ліку і Белнацкама, да сутнасці якога мы яшчэ пазней вернемся) з боку бальшавікоў тады наогул можа ісці гаворка? Гэта было б тое самае, калі б, напрыклад, кіраўнікі БССР у 1942-м ці ў 1943 годзе паехалі ў Берлін да Адольфа Гітлера, каб атрымаць у апошняга дазвол на вядзенне партызанскай барацьбы ў Беларусі!

А цяпер пра шырокі кантэкст тых падзей, якога "не заўважыў" спадар Марзалюк. Разважаючы пра гісторыю вельмі няпростага працэсу абвяшчэння асобнай і самастойнай беларускай дзяржавы ў 1918 годзе, нельга абмінуць праблему савецка-нямецкіх перамоў, якія вяліся ў Брэсце, як мы памятаем, пачынаючы з 9 (22) снежня 1917 года – гэта значыць у той час, калі ў Мінску ўжо сабраліся і актыўна працавалі дэпутаты Першага Усебеларускага з'езда.

Беларускія савецкія (і нават некаторыя постсавецкія) гісторыкі з непрыхаваным неразуменнем, а тое і з абурэннем гаварылі пра непахісную пазіцыю кайзераўскай Германіі на брэсцкіх перамовах: маўляў, яны, сякія-такія, не дапусцілі на перамовы ніякіх прадстаўнікоў ад Беларусі. Пры гэтым традыцыйна замоўчваўся факт, што імперскія палітыкі тагачаснай Германіі ў гэтым пытанні папросту не хацелі "крыўдзіць" бальшавікоў. Вядомыя сёння бязлітасныя дакументы сведчаць пра тое, як у 1917 годзе кайзераўскія спецслужбы актыўна падтрымлівалі і фінансавалі прыход да ўлады ў Расіі менавіта бальшавіцкай партыі. У сакрэтнай запісцы начальніка берлінскай секцыі палітычнага аддзела кайзераўскага Генеральнага штаба на адрас германскага МЗС за 17 (30) сакавіка 1917 г. чытаем наступнае (тут і далей пераклад з нямецкай мовы наш. – **Л.Б.**): *"Вялікая колькасць рускіх, якія жывуць у эміграцыі ў Швейцарыі, хацелі б вярнуцца на Радзіму. Антанта ў прынцыпе з гэтым згодная; толькі частка прыхільнікаў рускіх рэвалюцыйных партый, якія выступаюць пры гэтым за неадкладнае заключэнне міру, пад ціскам Англіі не выпускаецца са Швейцарыі"* (факсімільная копія гэтай і наступнай запісак апублікавана расійскім гісторыкам Акімам Аруцюнавым). Далей у згаданай запісцы прапануецца вырашыць пытанне аб пропуску ў Расію праз тэрыторыю Германіі групы палітыкаў з ліку бальшавікоў, эсэраў і бундаўцаў. У "апламбіраваным вагоне", які пасля Германіі яшчэ праехаў праз тэрыторыю Швецыі і Фінляндыі, 3 (16) красавіка ў Расію прыбыла 31 асоба, на чале з бальшавіцкімі дзеячамі Леніным, Зіноўевым (з жонкамі), Інесай Арманд, а ў тым ліку агенты нямецкага Генеральнага штаба Андэрс (псеўданім – Рубакоў) і Эрых (Ягораў). У данясенні нямецкага Генеральнага штаба за 8 (21) красавіка 1917 г. (№ 551) кайзераўскі ўрад атрымаў наступную інфармацыю: *"Штайнвакс тэлеграфаваў са Стакгольма 17 красавіка: "Прыезд Леніна ў Расію ўдаўся. Ён працуе цалкам паводле нашых пажаданняў…"*. Праз пэўны час Уінстан Чэрчыль у сваіх нататках запіша: *"…Немцы адчулі радаснае трапятанне, калі павярнулі супраць Расіі самы жахлівы від зброі. Яны завезлі Леніна са Швейцарыі ў Расію, як бацылы чумы, у закрытым вагоне"*.

Але нямецкія ўлады не проста даставілі бальшавіцкіх правадыроў да месца прызначэння: яны шчодра фінансавалі іх антыўрадавую дзейнасць. Нямецкі сацыял-дэмакрат Эдуард Бернштэйн пазней у артыкуле "Цёмны капітал Варвурыса", апублікаваным у газеце "Форвертс", засведчыць: *"Цяпер я з абсалютна надзейных крыніц высветліў, што гаворка ішла пра велізарную суму – несумненна большую за пяцьдзясят мільёнаў залатых марак, г.зн. пра такую агромністую суму, што ў Леніна і яго таварышаў не магло быць аніякага сумневу наконт таго, з якіх крыніц гэтыя грошы ішлі.*

Адным з вынікаў гэтага была Брэст-Літоўская дамова".

(Для даведкі: вартасць тагачаснай адной залатой маркі на той час адпавядала 0,36 г чыстага золата: выходзіць, што бальшавікі атрымалі на сваю "плённую працу" ад нямецкага ўрада каля 18 тон золата!)

Дарэчы, Бернштэйн прапаноўваў бальшавікам і іх нямецкім сатэлітам прыцягнуць яго да германскага суда "або да суда Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу", калі яны лічаць, што ён падаў несапраўдныя звесткі. Але ані расійскія бальшавікі, ані нямецкія камуністы "чамусьці" гэтага рабіць не сталі… У сярэдзіне 40-х гадоў былі раскрыты архівы германскага Міністэрства замежных спраў, у якіх змяшчаліся адпаведныя распіскі на атрыманне грошай, падпісаныя ўпаўнаважанымі бальшавікамі.

Зрэшты, у грунтоўнай працы "Утопія ва ўладзе", напісанай дактарамі гістарычных навук Міхаілам Гелерам (у эміграцыі – прафесар Сарбоны) і Аляксандрам Някрычам (пасля выезду з СССР – навуковы супрацоўнік Гарвардскага ўніверсітэта), гаворыцца наўпрост: *"Проблема немецких денег, которая так волнует историков – проблема этическая. Для Ленина, буржуазной морали не признававшего, вопроса: брать или не брать? – не было"*.

Усяго гэтага пасланыя ў Брэст на пачатку студзеня 1918 г. наіўныя дэлегаты выканкама Усебеларускага з'езда, натуральна, не ведалі…

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, кандыдат філалагічных навук.

ФЕСТЫВАЛІ

Чаго не зробіш дзеля любімай вярблюдзіцы?

У той час як сусветная спартыўная грамадскасць абмяркоўвае дыскваліфікацыю расійскіх спартсменаў, якія былі прымушаны ўладай да ўжывання мяльдонію і іншых хімічных сродкаў падтрымання сябе ў выдатнай форме, трагедыя дыскваліфікацыі закранула нават вярблюдаў. Згодна з паведамленнем агенцтва Daily Mail, у Саудаўскай Аравіі былі адхілены ад удзелу ў штогадовым конкурсе вярблюджай прыгажосці 12 удзельнікаў, гаспадары якіх выкарыстоўвалі ботакс, каб зрабіць сваіх жывёлін больш прывабнымі.

Прызавы фонд фестывалю вярблюдаў, які праходзіць у Эр-Рыядзе на працягу 28 дзён, складае 57 мільёнаў долараў: як бачыце, дзеля такіх грошай гаспадар можа не толькі выкарыстаць ботакс і касметыку (што таксама было), але ж і зрабіць асабліва ўлюбёнай вярблюдзіцы пластычную аперацыю.

Фестываль вярблюдаў у Саудаўскай Аравіі – мерапрыемства традыцыйнае. Апроч спаборніцтваў арганізатары прадугледзелі яшчэ і адмысловы вярблюджы кірмаш: там можна набыць тавары з вярблюджай воўны, пакаштаваць вярблюджага малака, паспрабаваць кіраваць "караблём пустыні" і нават даведацца, як вандраваць на вярблюдзе, арыентуючыся па зорках.

ПАМЯЦЬ

Владимир ОРЛОВ:
«Перед камерой все были правдивы…»

Сегодня, 26 января, день памяти Владимира Георгиевича Мулявина – 15 лет назад перестало биться сердце всенародно любимого музыканта. Днем по каналу «Беларусь-3» будет показан новый документальный фильм «Песняр. Сердцем и думами», посвященный Владимиру Георгиевичу Мулявину. А завтра по этому же каналу его повторят вечером. Фильм действительно достоин самой широкой демонстрации. Создал его известный режиссер Владимир Орлов, добрый товарищ Владимира Георгиевича, который не раз снимал «Песняров» и Мулявина в расцвете творчества. Да что говорить: самый первый фильм об ансамбле тоже сделал именно Владимир Орлов, и было это еще в 1971 году. А теперь вот фильм-реквием: о драме большого художника, пережившего свой талант, о трагедии человека, которого буквально несло к безвременному концу. Фильм искренний, честный. Но мог ли когда-то подумать Владимир Орлов, что жизнь предложит ему такую тему?

– Я вообще думал делать трилогию: «Песняры» – белорусское чудо», «Песняры» – прерванный полет». И третья часть – «Размененные «Песняры». Я опросил 29 музыкантов, самых известных членов коллектива «Песняры». Материал целиком хранится в государственном архиве кинофотофонодокументов в Дзержинске. Перед камерой все были правдивы. После съемок – откровенны. Но теперь думаю, что третьей части делать не надо. Не надо дешевить, разменивать образ Мулявина.

– Владимир Георгиевич будто устал от жизни, будто сам хотел приблизить конец…

– Это мы сейчас понимаем. А когда я начал собирать материал, не понимал. У старлея, который первым приехал на место катастрофы, спрашиваю: «0,6 промилле, которые были в крови у Владимира Георгиевича, это много или мало?» Он развел руками и сказал: «Радуница…» Володя возвращался с кладбища, где похоронена сестра. Думаю, он будто нарочно испытывал судьбу.

– В фильме трогает и запоминается именно эта нота: трагедия Мулявина – человека и художника.

– Саша Катиков, солист и композитор ансамбля, сказал: у нас не было кризиса творческого, у нас был кризис человеческих отношений.

– Бил бы сильный родник творчества, кризис не случился бы. Но родник иссяк.

– В последние семь лет перед своим распадом «Песняры» не сделали не то что новой программы, но даже обработки новой народной песни.

– До некоторого времени все стыдливо обходили истинную причину распада ансамбля, но вы в фильме вскрыли этот нарыв. «Песняры» распались. Мулявин считал ушедших предателями. Сами музыканты считали, что поступили рационально, они пошли за деньгами – в фильме этот вывод очевиден. Музыканты не обиделись?

– Мисевич, Дайнеко, Катиков – мои приятели. Нет, они не обиделись. Все отболело. В какой-то момент появилось пять ансамблей «Песняры» (или даже шесть?) – мне Кашепаров рассказывал. Но какое это имеет значение? Это как собирать крошки со стола после обеда. Но в первых, мулявинских, «Песнярах» отношения между членами коллектива были непростые.

У Володи была нетерпимость к образованию. Когда уходили учиться Борткевич, Кашепаров, Мулявин сердился. Когда второй раз – уже на композиторское отделение – поступил учиться Игорь Паливода, Мулявин сказал: «Или «Песняры» – или учеба». Добавлял с иронией: «Мы консерваториев не кончали, а Советский Союз и Европу поставили на уши». В этой точке начиналась располюсовка членов ансамбля. Собственно, Валентин Бадьяров тоже вспоминал, что никогда не видел в руках у Мулявина нот. Володя почти не записывал свои песни, они рождались в голове, в душе, а на репетициях он просто голосом давал ребятам их партии.

– А Светлана Мулявина-Пенкина рассказывала мне, что муж занимался за роялем.

– Знаете, то, что говорила Света (Царство ей Небесное), можно спокойно делить на восемь. Тот же Игорь Паливода с большим сарказмом описывает взаимоотношения «головы с юбкой», как он называл отношения Мулявина со Светланой Пенкиной. Она довольно грубо вмешивалась в творчество коллектива, приходила на репетиции и командовала. Мисевич сердился: «Муля, иди успокой свою юбку!» Он отмахивался: «Я занят». Она пыталась заменить ему всех. Такое нередко случается у творческих людей.

– Коллектив ревновал…

– Марина Мулявина и Ольга Брилон написали книгу «Владимир Мулявин: недосказанное». Там есть прямая речь Владика Мисевича: «Вторая жена подсадила Мулявина на стакан. Третья добила этим». Откровенно говорит. Ребята вспоминают, что две-три недели ансамбль работает на гастролях – Мулявин в отличной форме. А приезжает домой в Минск – и после выходных приходит на работу разбитый, больной. У Светы был дар разрушения, а не созидания.

– Вы определили для себя, как относиться к теперешним государственным, как их называют, «Песнярам»?

– Это смешно. Пародийный вариант. Зачем? Все равно что сеять жареные семечки и поливать их кипяченой водой. У них нет духа «Песняров», потому что рядом с Мулявиным никого из них на сцене не стоял.

– Кроме Скороходова…

– Да нет его там давно!

– Но вот «Белорусские Песняры» какое-то время довольно успешно пульсировали…

– Так они и сейчас пульсируют. Дайнеко свои 70 лет отмечал в переполненном зале.

– Первый фильм об ансамбле вы сняли в 1971 году. Коллектив был в самом расцвете?

– Нет, он был еще, так сказать, в бутоне. С Мулявиным я познакомился на выездном концерте артистов Белгосфилармонии в Могилевской области – Глуск, Осиповичи… Ехали в страшно неудобном автобусе, будто склепанном в колхозной кузне: все дребезжит, трясется. Я сидел рядом с красивой женщиной – Лидой Кармальской, первой женой Владимира Мулявина. Он тоже был в автобусе, но сидел впереди. Вдруг пошел жуткий дождь. Над некоторыми сиденьями стало капать с крыши, и артисты спокойно раскрыли зонтики. Сюрреализм!

А Лида деловито развернула ссобойку, угостила меня и попросила передать бутерброды мужу. После этих гастролей мы стали общаться с Володей, я приходил к нему в ДК на камвольный комбинат. Мулявин с ребятами играл там на электрогитаре на танцах. Девушки приходили в сапогах, а в газетках – полиэтиленовых мешков еще не было – приносили туфельки и переобувались. Вскоре появились «Лявоны», и я пришел на их концерт в Дом офицеров. И буквально накануне отъезда ансамбля в Москву на всесоюзный конкурс виделся с Мулявиным.

– Ваш фильм «Песняр. Сердцем и думами» создан по заказу Министерства культуры. А почему министерство выбрало именно вас?

– Был объявлен конкурс, и мой сценарий победил. Но надо отдать должное Светлане Мулявиной-Пенкиной: она хотела хлопотать за фильм в министерстве. Может, хотела стать соавтором сценария? Я был бы не против. Но к съемкам, конечно, ее не подпустили бы.

Елена МОЛОЧКО.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вадзім ЖУК:
«На бязрыб'і – і рак за шчасце»

Вядомы беларускі футбольны суддзя распавёў "Народнай Волі" пра тое, чаму беларускім футбалістам варта радавацца і турніру "для няўдачнікаў".

Днямі прайшла жараб'ёўка новага турніру УЕФА – Лігі нацый. Як вядома, футбольная зборная Беларусі трапіла ў самую слабую лігу D. Яе склад такі: Беларусь, Люксембург, Малдова і Сан-Марына.

Дарэчы, падчас апошняга адборачнага турніру да чэмпіянату свету беларусы, якія занялі апошняе месца ў групе, змаглі ўзяць у двух матчах з камандай Люксембурга толькі адно ачко...

– Нашы саперніцкі не адносяцца да ліку мацнейшых, таму ёсць шанц пазмагацца ў групе за першае месца, – адзначае Вадзім Дзмітрыевіч. – Усе тры каманды мы добра ведаем, хаця з люксембургцамі ў беларусаў, як вядома, асаблівая "любоў". Але, калі ты нечага варты, то дакажы, што паражэнне ад зборнай Люксембурга ў адборачным турніры – гэта ўсяго толькі выпадковасць. Вось шанц – пакажы сваю сілу.

– Не сорамна выступаць у турніры, дзе сабраліся, як кажуць, каманды-"няўдачнікі"?

– Што зробіш, калі беларускі футбол у апошні час знізіў свае міжнародныя рэйтынгі. Хаця гэта адназначна сёння не наша месца, мы павінны быць значна вышэй. На жаль, пакуль маем тое, што маем.

– А чаму зборная Беларусі пакацілася ўніз?

– Вы ж паглядзіце, што зараз зусім няма беларускіх футбалістаў, якія выступалі б у топавых еўрапейскіх клубах. Нават за расійскія альбо ўкраінскія клубы, дзе ўзровень чэмпіянатаў усё ж такі вышэй, нашых таксама няшмат. А калі няма практыкі ігракоў у моцных клубах, то адкуль чакаць высокіх вынікаў зборнай?

– Ці патрэбны такі турнір, як Ліга нацый?

– Як кажуць, на бязрыб'і – і рак за шчасце. Прагназуецца, што турнір дапаможа ўзняць інтарэс да футбола ў краінах, якія будуць удзельнічаць у Лізе нацый. Але пабачым, што атрымаецца...

Алесь СІВЫ.

ДАРЭЧЫ

Расклад матчаў зборнай Беларусі ў Лізе нацый:

8 верасня: Беларусь–Сан-Марына, Люксембург–Малдова;
11 верасня: Малдова–Беларусь, Сан-Марына–Люксембург;
12 кастрычніка: Беларусь–Люксембург, Малдова–Сан-Марына;
15 кастрычніка: Беларусь–Малдова, Люксембург–Сан-Марына;
15 лістапада: Сан-Марына–Малдова, Люксембург–Беларусь;
18 лістапада: Малдова–Люксембург, Сан-Марына–Беларусь.

В ГОСТЯХ У «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

ПИАНИСТ

Игорь Оловников – в числе лучших и самых известных белорусских музыкантов. Масштаб его дарования огромен. Он не только исключительный пианист, блестящий органист, замечательный преподаватель, но еще и талантливый композитор. Да-да! Ноты его транскрипций разлетаются по всему миру!

Встреча наша долгое время откладывалась, перерыва в графике все не находилось. А он у народного артиста Беларуси, солиста Белгосфилармонии, профессора Белорусской государственной академии музыки действительно очень плотный.

«Нам становится тесно во времени»

– Игорь Владимирович, в начале года всегда кажется, что время начинает какой-то новый отсчет. На ваш взгляд, оно бежит все быстрее и быстрее?

– Совершенно точно. Такое впечатление, что нам становится тесно в том времени, в котором мы раньше жили нормально. Мне хочется многое сделать, выучить, сыграть, написать, куда-то поехать, но я просто ничего не успеваю. Приходится свое расписание корректировать, а иногда и вовсе от чего-то отказываться. Но, наверное, жизнь и должна быть такой – напряженной, насыщенной и быстрой. XXI век – это век скоростей, высокой энергии и бурных событий.

– Но «время» в вашей профессии – это ведь синоним творческой свободы и эксперимента! В противном случае может получиться та самая главная беда наших дней – усредненная история.

– Я знаю, что такие композиторы, как Бетховен или Чайковский, очень любили побродить на природе, ни о чем не думая, кроме своей музыки, своего замысла. Может быть, нам сейчас этого как раз и не хватает. Мы живем в эпоху уплотненного графика и очень большой урбанизации всей жизни. Месяцами не видим ничего, кроме рабочего места и городской суматохи.

– А порой и не слышим – настоящей музыки… Вообще, как сильно все изменилось! Еще пару веков назад популярнейшим развлечением была опера, и у ее создателей – скажем, того же Верди – была просто ошеломляющая известность. Наш масскульт, мягко говоря, не дотягивает до уровня итальянского гения…

– Я уверен, что все быстротекущие жанры, которые относятся к легкой музыке, уходят так же, как и приходят, быстро. А остается классика. Ведь не зря существует мнение, что она вечна. Потому что классическая музыка таит в себе такие истины, которые дороги человечеству в любые времена и этапы его существования.

Звания не имеют никакого смысла

– Игорь Владимирович, вы профессор, народный артист, с 60-летним юбилеем вас поздравлял президент. Все это греет музыкальную душу?

– Гонка за всяческими регалиями существует только в странах бывшего Советского Союза. В мире нигде этого нет. Я убежден, что звания ничего не дают и не имеют никакого смысла. Музыкант известен прежде всего по фамилии. Многие и сейчас не знают, что я народный артист. А я и не говорю.

– А ваш отец (тоже, кстати, народный артист), известный на весь Союз композитор, да что тут говорить – автор гимна БССР, также не кичился своим высоким статусом?

– У отца главными были скорее не звания, а должности. И это как раз во многом исковеркало его творческую судьбу. Он не занимался тем, чем был призван заниматься, – композицией. Все его силы были направлены на руководство консерваторией, депутатскую работу и работу в ЦК. Будучи обремененным всеми этими регалиями, давлением некомпетентного начальства, отец, к сожалению, меньше внимания уделял творчеству, семье, каким-то человеческим проявлениям. Он пытался, но у него это плохо получалось.

– Это вы сейчас рассказали о Владимире Оловникове – деятеле. А об отце? Память ведь всегда нам оставляет какие-то яркие воспоминания.

– Это был редкий пример, когда мы поехали на озеро поиграть в футбол. Неподалеку от нас ходила женщина с мальчиком. Было видно, что люди совсем бедные, очень скромно одеты. И тут отец говорит: давай подарим парнишке мяч. Я, естественно, возмутился. Но папа спокойно взял мяч и отдал его тому мальчику. Вообще, он был очень добрый человек.

– Известно, что королеву делает свита, а короля – его королева. Ваша мама была настоящей хранительницей семейного очага?

– С ее удивительным голосом она могла бы стать блестящей оперной певицей, но семья для нее всегда была на первом месте. Маме уже 91 год, но в ней по-прежнему очень силен некий энергетичный дух. Она в курсе всех событий, следит за новостями, недавно попросила купить ей планшет, с блеском освоила электронную книгу.

Высокие материи

– Музыканты, как правило, живут не календарными годами, а концертными сезонами. А те, кто имеет отношение к учебному процессу, еще и наборами. В этом году первокурсники порадовали?

– Мне трудно вести какую-то статистику, потому что я беру мало студентов. Класс в Академии музыки у меня совсем небольшой, всего шесть человек. Но вообще ребята у нас неплохие. Все же к нам поступают лучшие в стране.

– Многие ваши коллеги готовят себе кадры, что называется, издалека. Преподают в лицее при Академии музыки, «ведут» будущих студентов с малых лет. Знакомая практика?

– Я всегда избегал работы с маленькими детьми. Мне это так не нравится, вы не представляете! В лицее я брал учеников несколько раз, но это было нерегулярно и доставляло мне огромное неудовольствие. Надо же иметь ангельское терпение!

– То есть к вам с невыученной наизусть программой студенту лучше не приходить?

– Я учился в Московской консерватории, там и речи не могло быть, чтобы кто-то играл профессору по нотам. Это же сразу высокие материи! Два-три урока – и экзамен. Здесь немножко по-другому. Иногда приходится переучивать студентов, с которыми не очень грамотно работали до нас. Поэтому технической задачей не брезгуем.

– И все же, глядя на вас, сложно представить, что вы можете выйти из себя. Жалуетесь на отсутствие ангельского терпения.

– Сердиться на студентов невозможно. Даже если они делают вещи, совершенно не состоятельные в этическом отношении. Это же классика жанра!

Музыку надо пропагандировать

– Почти каждый ваш концерт – это Шопен, Бетховен или Бах. Композиторы-спутники?

– Вы правы. Исполнение сочинений этих авторов, погружение в их музыку доставляет мне наибольшее наслаждение. Хотя в жизни я прошел разные этапы. Но с возрастом, когда ничего не остается, мы приходим к чему-то однозначному, выбирая для себя главное.

– Интересно: Бах – ваш абсолютный кумир. А Моцарт? Пожалуй, только его гений можно сопоставить с космосом Баха.

– Наверное, дело в моем мировосприятии. Я люблю музыку, где есть напряженный психологизм, конфликт, трагедия. В музыке Моцарта все это тоже присутствует, и тем не менее главное его кредо – свет. Моцарт – это среда солнца и среда услады слуха. Такова была эстетика его эпохи. Так что Моцарт очень интересный композитор, но моим кумиром он никогда не был.

– Порой до слез обидно, когда на каком-нибудь совершенно замечательном филармоническом концерте сидишь в полупустом зале. Кто виноват и что делать?

– Хорошо организовать публику – это искусство. В филармонии же этим почти никто не занимается. Раньше у нас были штатные распространители билетов. Они ходили в народ, рассказывали о концертах, и им удавалось многих заинтересовать. Сейчас считают, что достаточно повесить афишу. Это неправильно. Музыку надо пропагандировать.

– Бывают в вашем сознании минуты абсолютной тишины? Ни одной ноты, ни одного пассажа, никакой музыки...

– Пожалуй, когда я занимаюсь своим хобби – сижу с паяльником. Правда, если мне нужно собрать схему или я добиваюсь функциональной работы какого-то устройства, музыка в голове все же прокручивается. Видимо, потому, что некоторые процессы, которые происходят в электронных цепях, напоминают процессы существования музыкального произведения.

– Игорь Владимирович, больше всего музыкальных долгожителей среди дирижеров. У инструменталистов концертный век, как ни крути, значительно короче. Вряд ли в 65 лет сопрано может успешно существовать на сцене. Вам, к слову, почти столько же. Пик карьеры пианиста?

– Трудно сказать. Мне кажется, я всегда чувствовал, что не реализовываю свои возможности. Мешало отсутствие времени, в некоторой степени лень, если выразиться более элегантно, какие-то побочные проявления человеческой натуры. Но, мне кажется, еще не наступил такой возраст, когда я вынужден буду сказать: сыграть лучше я уже не смогу.

Алина СТРАШКЕВИЧ.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 29 ЯНВАРЯ

Беларусь 1
06.00, 07.20, 08.15 «Доброе утро, Беларусь!».
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 00.15 «Новости».
07.05, 08.05 «Новости экономики».
07.10, 08.10, 18.15, 23.55 «Зона Х».
09.10 «Главный эфир».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 **«Двойная сплошная».** Сериал.
12.35, 14.30, 15.25 **«Мой лучший враг».** Сериал.
15.15, 18.00 «Новости региона».
17.05 «Белорусское «Времечко».
21.00 «Панорама».
21.50 «Наши».
22.05 **«След».** Сериал.
23.35 «Арена».
